Пролетарыяту, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навукарыстаныя рукапісы назад аўтарам не сарочэнцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. „ 3 „ — 2 р. — к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: інтагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нашпарэлі пасьпераз тэксту 1 р. — к. За радок нашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарожэй. Зьнізіны тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Бесспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (3-ці дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 7 (2195) Нядзеля, 8-га студзеня 1928 г.

Перавыбары саветаў БССР адкладзены да восені бягучага году.

Сёньня публікуецца пастанова прэзыдыуму ЦВК БССР аб перанясеньні перавыбараў саветаў і правядзеньня зьездаў саветаў на восень гэтага году. Пастанова прэзыдыуму ЦВК аснована на рашэньні прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР аб перанясеньні перавыбараў саветаў па ўсім Саюзе ССР на восень 1928 году.

Гэтыя рашэньні выкліканы цэлым шэрагам хадайнічаньняў з месц кіруючых і нізавых савецкіх органаў. Чым матывіруюцца гэтыя хадайнічаньні? Якія прычыны прымусілі вярхоўныя органы савецкае ўлады адкласьці перавыбарчую кампанію?

Першая прычына—гэта тая акалічнасьць, што нам неабходна зараз-жа, не адкладваючы ні на адзін дзень, правесьці ў жыцьцё шэраг гаспадарчых мерапрыйманьняў, выцякаючых з рашэньняў XV-га партыйнага зьезду, якія накіраваны да ўзмацненьня пасьпяховага ажыцьцяўленьня намі задач сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Кампанія-ж па перавыбарах саветаў, бязумоўна, затрымала-б тэмп правядзеньня гэтых неадкладнейшых мерапрыйманьняў. З боку партыйных і савецкіх органаў гаспадарчым мерапрыйманьням павінен быць аддадзены цяпер максімум увагі.

Другая прычына—гэта цяжкасьць правядзеньня шэрагу кампаній адначасова на працягу 2-3-х месяцаў зімняга часу. Зараз заканчваецца адбываўшаяся кампанія па перавыбарах каапэратыўных, правядзеньне перавыбараў у сялянскіх камітэтах грамадзкай узаемадапамогі, кампанія па перазаключэньню калектыўных умоў, хлебазагатоўчая кампанія, намячаецца падрыхтоўка да весьненняй пасяўной кампаніі і г. д. Усё гэта разам узятае не дал-б нам цяпер магчымасьці ўдзяліць досыць увагі перавыбарам саветаў, як важнейшай палітычнай кампаніі.

Апрача таго, трэба мець на ўвазе наступнае—мы заўсёды імкнуліся і імкнёмся, праводзячы выбары ў саветы, уцягнуць шырокія пласты новых кадраў работнікаў у саветы: рабочых, батракоў, жанчын, беднякоў і лепшых сераднякоў сялян, ставячы найбольш здольных адразу на кіруючую, адказную савецкую і гаспадарчую работу аж да цэнтральных органаў. Рабочаму ад варстату і селяніну ад плуга нялёгка адразу, у кароткі час азнаёміцца і ахапіць усю работу, якая на яго ўскладаецца: за мінулыя месяцы яны толькі азнаёміліся з умовамі, абставінамі і сталі ўцягвацца ў практычную работу. Перавыбары саветаў маглі-б цяпер толькі ўнесьці перабой у іх практычную работу і зьменшылі-б каштоўнасьць вынікаў іх дзеславой работы. Патрэбен значна большы тэрмін для вылучэньня з асяродзьдзя працоўных для поўнай падрыхтоўкі іх да савецкага будаўніцтва.

Вось галоўныя прычыны, якія вымусілі мясцы хадайнічаць, а Цэнтральны Выканаўчы Камітэт прыняць рашэньне аб адкладаньні перавыбараў саветаў да восені.

Што з гэтага вынікае? Якія задачы цяпер стаюць перад намі? Нам трэба перш за ўсё ўзмацніць усю нашу работу ў галіне эканамічных мерапрыйманьняў па ўсіх лініях. Цяпер намячаецца рэалізацыя сялянскай выкрышнай пазыкі. Гэта задача павінна быць цалкам выканана. Узмацніць садзейнічаньне з боку партарганізацыі і саветаў каапэратыўнаму будаўніцтву, асабліва на вёсцы. Узмацніць кампанію па загатоўцы хлеба і сыравіны, дабіваючыся максімуму практычных вынікаў у гэтай кампаніі. Старанна падрыхтаваць і правесьці канкрэтныя мерапрыйманьні, зьвязаныя з налыходзячай весьненняй пасяўной кампаніяй і г. д.

У сувязі з адкладаньнем перавыбараў саветаў, практычная дзелавая і масавая работа саветаў павінна быць узмоцнена да поўнага напружаньня. Як раней,—усю работу саветаў над шырокі кантроль мас. Барацьба з бюракратызмам, уцягваньне шырокіх мас рабочых і работніц, сялян і сялянак у саветы, іх сэкцыі і камісіі павінна праводзіцца з неаслабнай увагай.

Больш справаздачнасьці перад насельніцтвам за работу саветаў, з поўным забесьпячэньнем дзеславое крытыкі і самакрытыкі ўнутры саветаў.

Наказы выбаршчыкаў да восені гэтага году павінны быць цалкам выкананы. Выкананьне наказаў і пастаноў вышэйстаячых органаў павінна правярацца саветамі рэгулярна, з адзначкай, што зроблена, што і к якому часу трэба зрабіць.

Рашэньні XV-га партыйнага зьезду УсесКП(б) і XI партзьезду КП(б)Б на пытаньнях палітыкі партыі ў вёсцы ставяць перад саветамі шэраг задач: пахутчэньне правядзеньня земляўпарадкаваньня, узмацненьне работы па падняцьцю культурнасьці вёскі, па замацаваньню сялянскага актыву вакол саветаў, па стварэньню груп беднаты пры саветах і каапэратывах, барацьба за пераход ад дробных сялянскіх гаспадарак да буйнага калектыўнага землякарыстаньня. Вось задачы, над практычным ажыцьцяўленьнем якіх павінны больш напружана працаваць дэпутаты саветаў да канца іх паўнамоцтваў, г. зн. да восені бягучага году.

Тыя дэпутаты, якія акажуцца нядзольнымі праводзіць у жыцьцё намечаныя партыяй і савецкай уладай задачы, могуць быць адкліканы выбаршчыкамі па сваёй ініцыятыве і па пастановах саветаў, не чакаючы перавыбараў—восені 1928 году.

Гэта права выбаршчыкаў і саветаў з поўнай яскравасьцю вызначаецца нашай Канстытуцыяй. Парадак ажыцьцяўленьня адкліканьня няпрыгодных дэпутатаў у саветах з вычэрпваючай дакладнасьцю ўстаноўлен пастановаю Прэзыдыуму ЦВК БССР за 30 сьнежня мінулага году.

Адкладаньне перавыбараў саветаў, усяе практычнае работы, зьвязанае з перавыбарамі, азначае узмацненьне практычнае і масавае работы саветаў, узмацненьне ўсіх эканамічных і культурных мерапрыйманьняў да сацыялістычнага будаўніцтва пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі.

А. ХАЦКЕВІЧ.

7 студзеня 1928 г.

Два твары амэрыканскага імпэрыялізму.

КЭЛЁГ ПРАПАНУЕ СЬВЕТУ „ВЕЧНЫ МІР".

АМЭРЫКАНСКАЯ АРТЫЛЕРЫЯ і ФЛЁТ ПАДНЯВОЛЬВАЮЦЬ ЖЫХАРСТВА РЭСПУБЛІКІ НІКАРАГУА.

АДКАЗ БРЫЯНА НА ПРАПАНОВЫ КЭЛЁГА.

ПАРЫЖ, 6-1. Вашынгтонскі карэспандэнт агенцтва Гаваса паведамляе: Французскі адказ на прапанову Кэлёга зга жаецца з прапановаю, каб згода была распаўсюджана на галоўныя эўрапейскія дзяржавы і іншыя краі, схільныя яе падпісаць Брыян, аднак, дамагаецца дапоўніць прапанову Кэлёга такім парадкам, каб яна ганьбіла кожную наступальную вайну ў якасьці сродку нацыянальнае палітыкі, і ня ганьбіла-б кожнае вайны, якая датыкалася-б захадаў абарончага характару.

* * *

ПАРЫЖ, 6-1. Вашынгтонскі карэспандэнт агенцтва Гавас паведаміў, што французкі пасол у Злучаных Штатах Клёдэль перадасьць сёньня ўраду Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў адказ на прапанову Кэлёга.

Французкі друк паведамляе, што водгук атрыманых тут вестак, французкае міністэрства замежных спраў згодзіцца на першую частку прапановы Кэлёга адносна аднаўленьня арбітражнага ўгавору між Францыяй і Злучанымі Штатамі з тым, каб перад угаворам была абвешчана дэклярацыя абодвых у адаў аб катэгарычнай адмове ўжываць сілу для ўрэгуляваньня магчымых рознагалосьсяў між абедзьвюма дзяржавамі. Газэты, аднак, зазначаюць, што Брыян адначасна зробіць агаворку адносна другое часткі прапановы Кэлёга і падкрэсьліць, што ўмовы, высунутыя Кэлёгам, супярэчаць абавязацельствам Францыі ў адносінах да Лігі Нацый.

Японскі прэм'ер „вітае" прапановы Кэлёга.

ТОКІЁ, 6-1. У гутарцы з прадстаўнікамі друку яконскі прэм'ер Танака заявіў, што спачуванае імкненьням Кэлёга дамагчыся ўтварэньня ўгавору аб адмове ад вайны, як сродку вырашэньня міжнародных канфліктаў. Танака хваліў «шчырасьць і ўздым» Кэлёга і адзначыў, што, калі тэрмін сучаснага ўгавору між Японіяй і Паўночна-Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі скончыцца ў жніўні, прапанова Кэлёга павінна быць уважліва разгледжана.

Не кулямётам, дык далярам.

ВАШЫНГТОН, 6-1. Міністэрства замежных спраў згадзілася на дачу пазыкі Нікарагуа, прызначанай на «выплату прэтэнзій і стратаў, учыненых грамадзянскаю вайною».

Адначасна прэзыдэнт Кулідж падаў у кангрэс прапанову аб асыгнаваньні крэдытаў «для ўпарадкаваньня» прэтэнзій аб выплаце страт, учыненых бамбардыроўкаю вайсковых суднаў Злучаных Штатаў мэксіканскаму гораду Вара-Круц у часе канфлікту між Злучанымі Штатамі і Мэксікаю ў 1914 г. Як дача пазыкі Нікарагуа, так і прапанова Куліджа аб урэгуляваньні мэксіканскіх прэтэнзій павінны дэманстраваць «збліжэньне» між Злучанымі Штатамі і латынскаю Амэрыкаю.

ДЭЗЭРТЫРСТВА З АМЭРЫКАНСКІХ КАРНЫХ ВОЙСК.

ВАШЫНГТОН, 6-1. Вайсковае камандаваньне войск Злучаных Штатаў у Нікарагуа паведамляе, што 2 амэрыканскія салдаты дэзэртавалі. Камандаваньне думае, што гэтыя салдаты служаць інструктарамі ў войску Сандзіна, чым і тлумачыцца палепшаньне тэхнікі ў яго войску і карыстаньне тактыкаю, звычайнаю для войска Злучаных Штатаў.

Ліндбэр выконвае волю амэрыканскага імпэрыялізму.

НЬЮ-ЁРК. Лётчык Ліндбэр, які робіць пераляёт на цэнтральнай Амэрыцы, прыляцеў у Манагуа (галоўны горад Нікарагуа) з Гандураса, зрабіўшы вялікага кола, каб не пралятаць над тым райёнам, дзе адбываюцца ваенныя аперацыі войска Злучаных Штатаў проці войска лібералаў Нікарагуа. У спатканьні Ліндбэра бралі ўдзел ня толькі члены рэакцыйнага ўраду Нікарагуа, але і рэакцыйныя лідэры лібералаў; урачыстасьці павінны былі адцягнуць увагу ад крывавых боек між Злучанымі Штатамі і войскамі лібералаў.

ПАД САЛОДКІЯ СЛОВЫ АБ „ВЕЧНЫМ МІРЫ".

ЭКСПЛЁАТАЦЫЯ КАЛЁНІЯЛЬНАГА ЖЫХАРСТВА.

НЬЮ-ЁРК, 27-12. Вайсковае міністэрства Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў у сваёй штогодняй справаздачы настайвае на неабходнасьці ўзмацненьня кантролю над Філіпінскімі выспамі. Вайсковае міністэрства адкрыта раіць мэтад палітычнага і эканамічнага прынечаньня мясцовага жыхарства дзеля абароны інтарэсаў амэрыканскіх капіталістаў.

Выканаўцы волі далярa.

НЬЮ-ЁРК, 6-1. Карэспандэнт «Асашыэйтэд Прэс» паведамляе, что міністр замежных спраў Нікарагуа Карлос Пазос (ва ўрадзе Дыяца), які выяжджае ў Гаванну, заявіў, што на панамарыканскай канфэрэнцыі ён адмовіцца абмяркоўваць пытаньне аб вайне ў Нікарагуа.

Пазос выразна падтрымлівае палітыку Злучаных Штатаў, якія імкнуцца не дапусьціць абмеркаваньня падзей у Нікарагуа на пан-амэрыканскай канфэрэнцыі.

Цывілізаваныя барбары

НЬЮ-ЁРК, 23-XII. У Кентукі натоўп у 300 чал. лінчаваў нэгра-рабочага, які абвінавачваўся ў забойстве наглядчыка. Цела нэгра было прабіта кулямі і потым спалена нэграмі.

У штаце Тэнісі натоўп павесіў 18-гадовага нэгра за тое, што ён, нібы, напаў на белую жанчыну.

Катастрофа на Сіці.

НЬЮ-ЁРК, 6-1. На нью-ёрскай біржы зьнізіўся курс каштоўных папер, а асабліва акцый прамысловых прадпрыёмстваў. Падзеньне курсу выклікана тым, што ў продаж былі пушчаны адразу вялікія пакеты акцый; прадавалася больш 3 з палов. мілёнаў акцый, што зьяўлялецца бясспрыкладнаю лічбаю нават для нью-ёрскае біржы. На біржы разыгралася бурныя сцэны перапуду.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму ЦВК Беларускае ССР

аб устанаўленьні тэрмінаў перавыбараў сельскіх і гарадзкіх саветаў і скліканьня райённых і акруговых зьездаў саветаў у 1928 годзе.

На падставе пастановы Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР ад 5 студзеня 1928 году „Аб перанясеньні тэрміну перавыбараў сельскіх і гарадзкіх саветаў і скліканьня вазасных (райённых), павятовых (акруговых), губэрскіх і абласных (краёвых) зьездаў саветаў на восень 1928 году", Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Пастанову Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту ад 26 лістапада 1927 году «Аб тэрмінах справаздачы і выбарнай кампаніі сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў, райённых і акруговых выканаўчых камітэтаў у 1928 годзе»—СКАСАВАЦЬ.

2. Перавыбары саветаў і скліканьне акруговых і раённых зьездаў саветаў перанесьці на восень 1928 году.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

7 студзеня 1928 году г. Менск.

У Саюзе ССР.

НА 7-ГАДЗІННЫ ДЗЕНЬ СА СТУДЗЕНЯ.

ПЕРАВОДЗІЦЦА 15 ТЭКСТЫЛЬНЫХ ФАБРЫК.

МАСКВА. Камісія СНК па падрыхтоўцы ўводу 7-мігадзіннага рабочага дню, пры Ўдзеле прадстаўнікоў ЦК саюзу тэкстыльшчыкаў і Галоўтэкстылю, разглядзела пытаньне аб уводзе 7-мігадзіннага рабочага дню і трох зьмен на прадпрыёмствах тэкстыльнае прамысловасьці і зацьвердзіла да пуску наступныя прадпрыёмствы ПА БАВАЎНЯНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ: па Яраслаўскім трэсьце—фабрыка «Красный Перекоп», па першым бавоўняным трэсьце—фабрыка імя Ногіна, па другім—Нікольская тканцкая фабрыка № 2, фабрыкі „Красное Знамя" і „Вперед", па трэцім—Дрэзьненская і Паўлава-Пакроўская, па Ўладзімірскім трэсьце — фабрыка імя Абэльмана, па Цьвярскім—фабрыка імя Вагжанава, па Іванава-Вазьнясенскім — фабрыкі „Большэвик", вялікая Шуйская і Верхня-Церэцкая. Па трэсьце «Пёстроткань»—фабрыка імя Сталіна і Собалева-Шчалкоўская.

Апроч таго Галоўтэкстылю і ЦК саюзу тэкстыльшчыкаў запрапанавана назначыць яшчэ адну фабрыку для пуску не ў тры зьмены з 7-мігадзінным рабочым днём.

Дзякуючы пуску вышэйпаманёных фабрык у тры зьмены, для трэцяе зьмены патрэбна будзе дадатковая рабочая сіла ў колькасьці каля 17-18 тысяч чалавек, прычым прынята будзе на працу ад 10 да 13 тысяч новых рабочых. Камісія зазначыла на неабходнасьць правядзеньня на гэтых прадпрыёмствах максімальна мажымае нагрузкі працы з тым, каб вольная рабочая сіла і лішкі на суседніх фабрыках былі выкарыстаны для запаўненьня трэцяе зьмены. Пытаньне аб апаце працы перададзена для пагоджаньня ў ЦК саюзу і Галоўтэкстылю з тым, каб гэтыя пытаньні былі аформлены, як дадатак да калектыўнага ўгавору.

Камісія зазначыла, каб пры найме новых рабочых пасьля правядзеньня нагрузкі, былі выкарыстаны ў першую чаргу пераростні, праз вывад іх з броні, і працягнуты да працы дзеці працуючых і беспрацоўныя члены саюзу, якія знаходзяцца на вучоце біржы працы (а там, дзе іх няма, у фабконах). Камісія прапанавала саюзу і Галоўтэкстылю падрыхтоўчую працу скончыць да 10 студзеня з тым, каб да 7-мігадзіннага рабочага дню перайсьці з 15 студзеня.

Выкрыты забойцы італьянскага віцэ-консула.

АДЭСА, 7-1. Крымінальны вышук і акруговы аддзел ДПУ выкрылі справу аб забойстве італьянскага віцэ-консула ў Адэсе Коцыё. Вінаватыя арыштаваны. Пры іх знайдзена частка рэчаў забітага.

АДГРУЗКА МЭТАЛЁТАВАРАЎ НА ВЁСКУ.

МАСКВА, 6-1. Мэталюргічным заводам дадзен загад аб пазачарговай адгрузцы мэталё-тавараў на вёску. Канторам Мэталёсьндыкату прапанавана ўжыць усе меры, каб заводы адгружалі першыя 10 дзён студзеня ўсе нормы мэталю, які быў вызначан для дастаўкі на вёску ў працягу ўсяго бягучага месяца. Выяўлялецца магчымасьць максімальнае адгрузкі і павялічэньня вырабу чыгуналітных і іншых мэталёвых тавараў. Для гэтае мэты на месцы камандыруюцца адказныя працаўнікі сындыкату. Мэталёвым заводам і канторам сындыкату прапанавана таксама ўсю належачую вёсцы мэталё-прадукцыю ў другім квартале адгрузіць не пазьней паловы лютага. Можна чакаць, што ў выніку гэтых мер колькасьць адгружанага для вёскі ў працягу студзеня і пачатку лютага мэталю перавысіць, прыкладна, у 2-3 разы першапачаткова вызначаныя нормы.

СТАНОЎЧЫ ПЕРАЛОМ У ХЛЕБАЗАГАТОЎКАХ.

СТАЛІН. Па Сталінскай акрузе на 1-е студзеня загатавана мілён 300 тысяч пуд. хлеба. Прыватнік у загатоўках амаль не бярэ ўдзелу. Гадовы плян у 2 мілёны пуд. будзе выканан са значным перавышэньнем.

* * *

ДНЕПРАПЯТРОЎСК. У Днепрапятроўшчыне наглядаецца павялічэньне хлебазагатовак. Мануфактура, прызначаная для дастаўкі на хлебазагатоўчыя раёны, пачала паступаць на месцы.

* * *

ХАРКАЎ. Наркамгандалю УССР прапанаваў Вукапсьпілцы, а таксама „Сельскаму Гаспадару" прэміраваць членаў праўленьня каапэрацыі, якія выявілі найбольшую актыўнасьць у хлебазагатоўках. Вукапсьпілцы запрапанавана абвясьціць выгавор шасьці райсаюзам за невыкананьне заданьня па адгрузцы пшаніцы для Сярэдняе Азіі. Недагружаную пшаніцу прапанавана адгрузіць у працягу трох дзён.

* * *

ВАРОНЕЖ, 6-1. За апошнія дні значна ажывіліся хлебазагатоўкі.

Загатоўцы паведамляюць аб узмоцненым падвозе хлеба.

Стан хлебазагатовак на Украіне.

ХАРКАЎ, 5-1. У гутарцы з супрацоўнікам Ратау Наркамгандалю УССР Чарноў паведаміў: усяго за першую палову кампаніі загатоўлена на Украіне 149 мілёнаў пудоў хлеба проці 145 мілёнаў пудоў, загатоўленых за той-жа час у мінулым годзе. Перавышэньне загатовак проці мінулагодніх усяго толькі на 3 з паловаю мілёны пудоў зьяўляецца вусім нязначным, калі ўзяць пад увагу тыя патрабаваньні, якія прад'яўляюцца да бягучае хлебазагатоўчае кампаніі, а таксама і тое, што на Украіне мы маем 3-ці ўраджайны год. Пасьля бурнага росту загатовак у першым квартале, з кастрычніка загатоўкі пачалі штомесяц падаць. Гэта тлумачыцца тым, што выручка насельня ад рэалізацыі прадукцыі сельскае гаспадаркі не адпавядала суме паступіўшых у першым квартале на Украіну прамтавараў. Што датычыць хлебазагатоўчага апарату, дык тут трэба сказаць, што нізавыя працаўнікі пасьля дадавальняючага правядзеньня кампаніі мінулага году, зараз выявілі некаторую расьпінасьць. Палітычныя абставіны ў краі (дыскусія) таксама не маглі не адбіцца на паслабленьні ўвагі савецкага апарату і партыйных арганізацый да хлебазагатоўчай кампаніі.

На другі квартал бягучага гаспадарчага году з усіх тавараў, наступаючых з саюзных рэспублік на Украіну (каля 80 проц.), накіравана ў вёску. З тавараў, прызначаных для вёскі 70 проц., накіроўваецца выключна ў хлебазагатоўчыя раёны. Асабліва ўвага зараз аддаецца стану хлебазагатоўчага апарату. Усе мерапрыёмствы, якія зараз праводзяцца, бязумоўна павінны аказаць у бліжэйшы час рашучы ўплыў на хлебны рынак.

Кастрычнікавы прызыў у Арцёмаўшчыне.

АРЦЁМАЎСК, 6-1. На сёньняшні дзень рабочымі пададзена 5 тысяч 138 заяў аб уваходзе ў партыю; з іх райённымі партыйнымі камітэтамі зацьверджана 3 тысячы 98 і канчаткова аформлена акрпарткомам 1.465. Зацьверджана кандыдатамі 25 жанчын з вытворчасьці.

14 новых дамоў Чырвонае арміі.

МАСКВА. Загадам Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР у адзнаку 10-цігодзьдзя Чырвонае арміі адчынена 14 новых дамоў Чырвонае арміі ў Баку, Ленінкане, Проскурце, Бэрдзічаве, Днепрапятроўску, Гомелі, Бабруйску, Беразоўцы, Нікольску, Усурыйску, Благавешчанску, Даўрыі, Ашхабадзе, Мэрвэ, Цэрмезе.

РАЗЛАД СЯРОД ПАЎДНЁВЫХ МІЛІТАРЫСТАЎ.

Раскол у Гаміндане.

ШАНХАЙ, 6-1. Паведамляюць, што адчыненьне навначанае ў Нанкіне сэсіі пленуму ЦК і ЦКК Гаміндану адкладаецца ў зьвязку з расколам унутры Гаміндану.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ЎХАНСКАЕ ГРУПОЎКІ ПРОЦІ ЧАН-КАЙ-ШЫ.

ТОКІЁ, 6-1. «Токіё Асані» зьмяшчае такое паведамленьне свайго шанхайскага карэспандэнта аб барацьбе між рознымі групоўкамі ўнутры Гаміндану: „Поруч з дзейнасьцю Чан-Кай-Шы, накіраванай да захопу нанкінскага ўраду, ворагі Чан-Кай-Шы, у руках якіх зараз знаходзяцца правінцыі Цьзянсі, Хэнань і Хубэй, пераходзяць у контр-наступ і згрупоўваюць у Ханькоу оваё войска пад камандаваньнем Бай-Цзун-Чы. У зьвязку з намерам Чан-Кай Шы кантраляваць становішча у Ухане пры дапамозе войска Хо-Чэна, уханскія мілітарысты падрыхтоўваюць выступленьне з мэтаю перапыніць шлях армії Фынь-Юй-Сяна і сіншанскім войскам. Бай-Цзунчы тэлеграфна заявіў пратест нанкінскаму Ўраду проці назначэньня Чан-Кай-Шы галоўнакамандуючым.

Уханская групоўка складаецца з генэралаў Чэн-Ч'єна, Лі-Цзун-Жэна, Ху-Цзун-До і Фан-Чэн-Сю; гэтая групоўка мае армію агульным лікам у 230 тысяч чалавек. Становішча Чан-Кай-Шы зусім не такое ўжо добрае.

Нанкінскі карэспандэнт «Асака Майнічы» паведамляе, што ўчора ў Нанкін прыехаў Чан-Кай-Шы. У адзнаку прыезду Чан-Кай-Шы адбыўся вялікі банкет. Выступаўшы на банкеце Чан-Кай-Шы заявіў: «Мэта майго прыезду сюды—склікаць канфэрэнцыю Гаміндану і паскорыць аднаўленьне паўночнае экспедыцыі».

Наступ Фыня.

ШАНХАЙ, 6-1. Водгук паведамленьня нанкінскага агенцтва Го-Мінь, войска Фынь-Юй-Сяна заняло Тайян-Фу (50 кілёмэтраў на поўдзень ад сталіцы Шандунскае правінцыі Цзінянь-Фу).

СТАЧКІ Ў ШАНХАІ.

ШАНХАЙ, 6-1. Служачыя магазынаў і складаў сушонае садавіны ў Шанхаі абвясьцілі забастоўку. Служачыя магазынаў па продажу рысу затрабавалі палепшаньня ўмоў працы, пагражаючы ў выпадку незадаволеньня гэтых патрабаваньняў абвясьціць забастоўку.

РАССТРЭЛЫ НЕ СУНІМАЮЦЦА.

ШАНХАЙ, 6-1. З Ханькоу паведамляюць, што там расстраляны 3 камуністы і адзін камуніст расстрэлены ў Учане.

Польшча напярэдадні выбараў.

Блёк буржуазных меншасьцяў трашчыць.

«Наш Пшэглёнд»—буржуазная ляўрэйская газэта на польскай мове, якая зьяўляецца органам прыхільнікаў блёку нацыменшасьцяў Польшчы, друкуе расьпачлівы артыкул, у якім чорнымі краскамі малюе становішча, у якім быццам рантам апынуўся буржуазны нацменшасьцевы блёк.

«Думка ўтварэньня блёку меншасьцяў, піша «Наш Пшэглёнд»,—у аснове сваёй слушная з погляду на абавязковую «выбарчую ардынацыю»—ня была тым ня менш цалкам прааналізавана ня толькі з прычыны ўнутрана-ляўрэйскіх супярэчнасьцяў, але і партыйнай дэфэрэнтызацыі, якая наступіла сярод украінцаў, беларусаў і немцаў у працягу мінулага пяцігодзьдзя».

„Клясавыя антаганізмы і арыентацыйныя спрэчкі зрабілі сваё"...

Калі так кажа «Наш Пшэглёнд»,—дык справа буржуазнага блёку стаіць дрэнна.

„Урадавы" сьпісак у Варшаве.

«Роботнік» паведамляе, што першае месца на «урадавым" сьпіску ў Варшаве займе князь З. Любамірскі—кансарватар, другое—адвакат Ф. Пасхальскі—прадстаўнік «радыкальных» груп, урэшце трэцяе—праф. В. Макоўскі—прадстаўнік партыі працы.

Новая тактыка „Вызваленьня".

Правадыры ашуканскай партыі „Вызваленьня", страціўшай усякі грунт сярод беларускага насьленьня, выпусьцілі і распаўсюдзілі ў Віленскім, Навагрудзкім і Беластоцкім ваяводствах адозву на беларускай мове, у якой заклікаюць «беларускі народ беларуска-літоўскіх зямель» да падтрыманьня партыі „Вызваленьне"—гэтага адзінага абаронцы інтарэсаў беларусаў.

НЯЎДАЛАЯ ПРАВАКАЦЫЯ.

ВАРШАВА. Па загадзе пракуратуры з 18 арыштаваных 21-га сьнежня ў Варшаве вызвалены 18.

Накант гэтага «Фольксэйтунг» піша: «Паліцыя завярала, што ёй удалося зьліквідаваць сур'ёзны камуністычны цэнтр. Таварылася, што нібы ў рукі паліцыі трапіла шмат кампрамэтуючага матэр'ялу, але ня мінула і двох тыдняў, як ад вялічэзнае сэнсацыі нічога не засталося».

«Народная Ніва».

«Дзеньнік Віл.» паведамляе, што 6. сьнежня «Грамады» Коўн прыступіў да выдаваньня прадвыбарнай часопісі «Народная Ніва».

Сусьветныя рэкорды ў панскай Польшчы.

Паводле статыстычных даных варшаўскія ўзломшчыкі кас у 1927 годзе падзвычайна інтэнсыўна разьвівалі сваю дзейнасьць. Агулам у працягу 1927 г. яны зламалі ў Варшаве 68 агнятрывалых, забіраючы 349000 злотых. Толькі ў двух выпадках узломшчыкі напаліся.

ПАСЫЎ У ГАНДЛІ.

За месяц лістапад прывезена ў Польшчу розных тавараў на 155581000 фр. золатам. Вывезена-ж з Польшчы на 133.464.000 фр. золатам. Вынік—пасыў (недабор) 22.117.000 франкаў зол. (38.021.000 польскіх злотых).

Гэтакую суму грошай Польшча павінна заплаціць з свайго золатога запасу замежным буржуям і капіталістам. Не надоўга хопіць амэрыканскай пазыкі.

Рэпрэсіі проці літоўскіх меншавікоў.

КОЎНЯ, 6-1. Ковенскія газэты паведамляюць, што па загаду ўлады ў Паневескім павеце зачынена 8 мясцовых арганізацый сацыял-дэмакратычнае партыі і 5 прафсаюзаў; у Целяшоўскім павеце зачынены мясцовыя арганізацыі сацыял-дэмакратычнае партыі. Сацыял-дэмакраты маюць намер скардзіцца на загад улады ў суд.

АРЫШТ АГЕНТАЎ ПЛЯЧКАЙЦІСА.

КОЎНЯ, 6-1. У мястэчку Віржа, дзе нядаўна былі выкрыты праклямацыі прыхільнікаў Плячкайціса, учынены вобыскі і арышты. У ліку арыштаваных—студэнт Піцётас, абвінавачаны ўладаю ў тым, што ён быў сакратар Рмо на зьезьдзе літоўскіх эмігрантаў у рызе.

КАРЭСПАНДЭНТ ПАТ'А ДАПУШЧАН У ЛІТВУ.

КОЎНЯ, 6-1. Карэспандэнт польскага тэлеграфнага агенцтва, якога прыгранічная ўлада не прапусьціла ў Літву праз польска-літоўскую дэмаркацыйную лінію, прыехаў у Коўню праз Рыгу.

Савецка-японскае гандлёвае збліжэньне.

ТОКІЁ. Усе японскія газэты агалашаюць новагоднюю гутарку гандлёвага прадстаўніка СССР Анікеева з прадстаўнікамі друку. Анікееў падкрэсьлівае пасьпяховае разьвіцьцё савецка-японскага гандлю і канцэсыйнае дзейнасьці японскіх фірм у СССР і выказвае надзею на падпісаньне рыбалоўнае канвэнцыі, што падрыхтуе глебу да падпісаньня савецка-японскага гандлёвага ўгавору.

Канфлікт у бэльгійскай горнапрамысловасьці.

ПАРЫЖ, 5-1. З Брусэлю паведамляюць, што «фэдэрацыя рыцараў працы» (бэльгійская рэвалюцыйна-сындыкалісцкая прафсаюзная арганізацыя) зьвярнулася да ўсіх горнарабочых Бэльгіі з заклікам скласьці адзіны фронт для адпору проці наступу прадпрыёмцаў, які абвострываецца ў зьвязку з крызісам у горнай прамысловасьці. Адозва «рыцараў працы» высоўвае: канкрэтныя прапановы, у тым ліку дзяржаўную дапамогу ўсім беспрацоўным, павялічэньне памеру дапамогі па беспрацоўі, устанаўленьне мінімуму заработку, вылічанага на аснове сярэдняга даваеннага заработку, скарачэньне працоўнага дню і г. д.

Выстаўка савецкіх фабрыкатаў у Аўганістане.

КАБУЛ, 5-1. Сёньня адчынілася першая выстаўка ўзораў савецкіх тавараў. На адчыненьні прысутнічалі аўганская ўлада, прадстаўнікі аўганскага купецтва і члены савецкае калёніі на чале з паўнамоцным прадстаўніком і гандлёвым прадстаўніком.

Выстаўка выклікае вялікую зацікаўленасьць.

Разгром фашыстамі баўгарскіх прафсаюзаў.

ПРАФІНТЭРН КЛІЧА ПРАЦОЎНЫХ ДА ПРАТЭСТУ.

МАСКВА. У зьвязку з разгромам фашысцкім урадам Баўгарыі прафарганізацыі, Прафінтэрн зьвярнуўся з адозваю да ўсіх працоўных: «Выканаўчае бюро Прафінтэрну,—заначана ў адозве,—заклікае ўсе ўваходзячыя ў яго арганізацыі выказаць міжнародную салідарнасьць у адносінах пакутнага пралетарыяту Баўгарыі праз адчыненьне шырокае кампаніі ў друку, наладжаньне мітынгаў і дэманстрацый пратэсту. Міжнародны пралетарыят павінен даць рашучы адпор фашысцкай рэакцыі».

МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС ПРАЛЕТАРСКІХ ВОЛЬНАДУМЦАЎ.

БЭРЛІН, 6-1. 4-га студзеня ў Кельне адчыніўся міжнародны кангрэс пралетарскіх вольнадумцаў. У кангрэсе бярэць удзел арганізацыі пралетарскіх вольнадумцаў розных краёў. Польская дэлегацыя арыштавана ў Польшчы, савецкая-ж дэлегацыя, з прычыны перашкод на выезд у Нямеччыну, прыедзе са спазьненьнем.

Старшыня кельскае акруговае арганізацыі пралетарскіх вольнадумцаў паведаміў, што кіраўніцтва нямецкіх чыгунак і кельская гарадзкая ўправа забаранілі расклейваць абвесткі аб кангрэсе ў падначаленых ім установах.

Старшыня міжнароднага абъяднаньня пралетарскіх вольнадумцаў Гартвіг прапанаваў ушанаваць памяць ахвяр ліпяўскіх падзей у Вене. Далей старшынствуючы агаласіў прывітаньні ад розных арганізацый.

Ад імя выканкому Камінтэрну і нямецкае камуністычнае парт

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

АДКАЗ БРЫЯНА НА НОТУ КЭЛЁГА.

ПАРЫЖ, 7-I. У адказе на ноту Кэлёга Брыян зазначае, што францускі ўрад гатоў супольна з урадам Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў запрапанаваць усім народам далучыцца да акту, ужо падпісанаму Францыяй і Злучанымі Штатамі аб адмаўленьні ад наступацельных войн і ўжыньні ў будучым мірных сродкаў дзеля вырашэньня канфліктаў, якія могуць паўстаць.

* * *

ВАШЫНГТОН, 7-1. Адказнае прапанаваньне Брыяна Кэлёгу абмежаваць рамкі будучага франка-амэрыканскага ўгавору аб вечным міры шляхам устанаўленьня розьніцы між наступацельнай і абаранёцельнай вайной, спаткана ў Вашынгтоне з нездавольнем. Злучаныя Штаты ня могуць узяць на сябе адказнасьці, няўхільнай пры вызначэньні паняцьця «наступацельная вайна». Міністэрства па чужаземных справах паранейшаму выказваецца супроць заключэньня ўгавору аб вечным міры толькі між Францыяй і Амэрыкай і вымагае далучэньня да яго трэціх дзяржаў.

БЕСАРАБЦЫ НІКОЛІ НЯ ПРЫМІРАЦЦА З ПРЫНЦЫПАМ «БЕСАРАБІЯ БЕЗ БЕСАРАБЦАЎ».

ВЕНА, 7-I. Як паведамляюць з Бухарэсту, бесарабскі дэпутат нацыянальна-сялянскай партыі Пеліван у гутарцы з супрацоўнікам «Адэвэрулс» заявіў, што насельнасьць Бесарабіі нездаволена становішчам адміністрацыйнага і фінансавага кіраўніцтва. Пеліван заявіў, што выбары ў Бесарабіі адбываюцца паранейшаму пад знакам тэрору і злоўжыцьцяў і «народныя прадстаўнікі» ў парляманце не карыстаюцца давер'ем жыхарства.

Бесарабцы—заявіў Пеліван,—ніколі ня прымірацца з прынцыпам «Бесарабія без бесарабнаў».

РАБОЧАЯ КЛЯСА ПРЫ НЭП'е.

У апошняй (XI) кніжцы «Планового хозяйства» В. Г. Яроцкі дае цікавыя данныя, якія характарызуюць становішча рабочае клясы ў СССР.

Данныя гэтыя надзвычайна красамоўна паказваюць, што на ўсім дягу мінулага дзесяцігодзьдзя нашае эканамічнае жыцьцё бесперарыву і ўсё больш перабудоўваецца ў інтарэсах рабочае клясы. Праўда, быў перыяд, калі рабочая кляса перажывала ў гады равалюцыі працэс дэклясаваньня, распыленьня.

Гэта былі гады грамадзянскае вайны. Пагоршаньне ўмоў жыцьця ў горадзе выклікала адліў рабочых у лепш забясьпечаную харчамі вёску. Рабочая кляса пачала ў гэты-ж час папаўняцца з тых гушчаў жыхарства гораду, якія раней адносіліся да разраду самастойных вытворцаў (саматужнікі, рамесьнікі), або належалі да непрацоўных груп. Пераход гэтых элемэнтаў у катэгорыю работнікаў па найме мэханічна даваў ім магчымасьць стаць членамі прафсаюзаў. І гэтыя, чужыя прафсаюзнаму руху элемэнты з году ў год павялічвалі колькасьць сяброў прафсаюзаў. У 1921 г. лік сяброў прафсаюзаў дасягнуў з прычыны гэтага 7.524.000 замест 1.946 тысяч у 1918 г. Але як толькі самастойныя вытворцы страцілі права быць членамі прафсаюзаў і здабылі магчымасьць працаваць на вольны рынак, дык пачынаецца натуральны адліў гэтых чужых прафруху асоб з складу прафсаюзаў. І ў канцы 1922г. лік сяброў прафсаюзаў скараціўся ў параўнаньні з 1921 г. амаль на палову (на 45,1 проц.).

З пераходам ва НЭП, адчыніўшы магчымасьць энэргічнага будаўніцтва сацыялізму, пачынаецца, такім парадкам, адваротны працэс — **працэс узмацненьня і аб'яднаньня рабочае клясы.**

Ужо ў студзені 1927 г. лік асоб, занятых наёмнаю працаю ў цэнзавай прамысловасьці, дасягнуў 2.766.000 чал., замест 1.627.000 у 1924 г, **перавысіўшы па сваім разьмеры даваенную колькасьць прамыслова-заводзкага пралетарыяту.**

Яшчэ больш цікавымі данымі зьяўляюцца лічбы В. Г. Яроцкага наконт росту матар'яльнага дабрабыту рабочае клясы. У 1913 г. разьмер рэальнага заработку ў цэнзавай прамысловасьці 30 руб. 49 кап. З ажыцьцяўленьнем новае эканамічнае палітыкі рух рэальнага заработку малюецца такім (у рублёх, у ўмоўным бюджэтным вылічэньні)

Гады	У абсалютных лічбах	У процантах да 1913 г.
1922	8,84	29,0
1923	13,54	44,4
1924	21,45	70,3
1925	26,24	86,0
1926	29,40	96,4
1927	31,48	103,2

Такім парадкам, **у цэнзавай прамысловасьці мы маем бясспрэчнае перавышэньне даваеннага ўзроўню рэальнага заработку.** Пры гэтым трэба яшчэ мець на ўвазе прыбыткі, якія зьяўляюцца зьмененаю формаю заработку, як дапамогі страхавое касы, культурнае абслугоўваньне і г. д. У 1925 г. адны толькі паступленьні ад сацыяльнага страхаваньня складалі 5 проц. бюджэту рабочага. Агульны разьмер заработку рабочага складае такім парадкам **109,8 проц. даваеннага ўзроўню.**

Гэты рост рэальнага заработку паглядаецца зусім не за кошт павялічэньня даўжыні рабочага дню. Наадварот, сярэдняя даўжыня рабочага дню да дзесяцігодзьдзя Кастрычніка складала 7,5 гадзін у суткі. Пры гэтым, 0,18 гадзін прыпадала на звыштэрміновую працу, якая вынаўнялася кожным рабочым сярэдня ў працягу 3,9 гадзін у месяц. Такім парадкам, фактычны рабочы дзень у прамысловасьці ўжо да дзесяцігодзьдзя Кастрычніка прыбліжаўся да 7-мі гадзіннага.

На што траціць рабочы свой заработак? Адказ на гэтае пытаньне даюць данныя бюджэтнага абсьледваньня УЦСПС па Маскве і Ленінградзе. Тут мы прывядзём таблічу вынікаў ленінградзкага абсьледваньня. Яна паказвае, што выдаткі ленінградзкіх рабочых разьмяркоўваюцца такім парадкам (у процантах)

	1908 г.	1918 г.	1926 г.
Памяшканьне . .	12,8	3,4	5,2
Апал і асьвятленьне	6,3	—	5,5
Харчы	48,2	71,7	47,6
Тытун і алкаголь .	5,3	—	4,8
Вопратка і туалет .	12,1	6,6	17,4
Гаспадарчыя рэчы .	2,1	—	3,2
Гігіена	3,6	3,4	0,9
Лекі	1,3	—	1,0
Культурныя і грам.-паліт. выдаткі .	3,9	3,1	6,8
Іншыя выдаткі . .	4,4	11,8	8,6

Як відно з гэтых лічбаў, рабочы траціць зараз меншую частку сваіх грошай на памяшканьне, апал і асьвятленьне, тытун і алкаголь. Затое павялічыліся выдаткі, якія сьведчаць аб вялікім росьце культурных затрабаваньняў рабочых. Асабліва павялічыліся выдаткі на вопратку і туалет, што зьлічае рабочы бюджэт СССР з рабочымі бюджэтамі найбольш культурных заходніх эўрапейскіх краёў, дзе рабочыя адзяваліся заўсёды лепш.

Паняволі ўзьнікае пытаньне, ці ня выклікаў рост выдаткаў на надворны камфорт пагоршаньня харчаваньня рабочага? Абсьледваньне харчаваньня ў горадзе паказвае, што за выключэньнем пэрыяду грамадзянскае вайны харчаваньне рабочага жыхарства з году ў год паляпшаецца і лікам і, што асабліва каштоўна, якасьцю. Асабліва значна ўзрасло спажываньне мяса і тлустасьці.

Нарэшце, яшчэ адно пытаньне—аб беспрацоўі. У пачатку 1927 г. лік беспрацоўных, водлуг матар'ялаў Наркампрацы СССР, складаў 1.050.000, прычым, колькасьць беспрацоўных па працягу ўсяго пэрыяду НЭП'у з году ў год павялічвалася. Але лічбы паказваюць, што **беспрацоўе павялічваецца выключна сярод некваліфікаваных рабочых, якіх выкідае ў горад вёска.** Сярод індустрыяльных рабочых беспрацоўе ня толькі не павялічваецца, але скарачаецца. З агульнага ліку беспрацоўных, зарэгістраваных на біржах працы, індустрыяльныя рабочыя складалі ў 1924 годзе 25,1 проц., а ў 1926 г. усяго 17,1 проц. Нават процант беспрацоўных сярод асоб інтэлігентнае працы зьменшыўся з 44,5 у 1922 г. да 19,6 у 1926 г. Затое некваліфікаваныя рабочыя, якія складалі ў 1922 г. 17,9 проц., у 1926 г. дасягілі 55,1 проц. у адносінах агульнага ліку беспрацоўных.

Вось яны, бесстаронькія лічбы, якія малююць становішча рабочае клясы.

Н.

Весткі адусюль.

АРТЫКУЛЫ ПРЫЯЦЕЛЯЎ СССР У БЕЛГРАДЗКАЙ ПРЭСЕ.

ВЕНА, 1-I. Браўшыя ўдзел у кангрэсе прыяцеляў СССР пісьменьнік Вазіч, разьбяр Стаяновіч і журналіст Рыбнікар друкуюць артыкулы аб СССР у 3-х найбольш распаўсюджаных і ўплывовых белградзкіх газэтах «Палітыка», «Время» і «Навіны», падкрэсьліваючы вялізны ўздым гаспадарчага і культурнага будаўніцтва СССР. Артыкулы напісаны ў вельмі спрыяючым для СССР тоне.

АСТРОГ ЗА ЗМАГАНЬНЕ ПРОЦІ ВАЙНЫ.

ПАРЫЖ, 4-I. За 9 артыкулаў, агалошаных у «Юманітэ» ў зьвязку з кампаніяй проці мілітарызму, камуніст Гейн засуджан да 2 гадоў зьняволеньня ў астрозе і 4000 франкаў штрафу, камуніст Сэнпрэ да 3-х месяцаў астрогу і 200 франкаў штрафу.

Аварыя італьянскага судна.

БЭРЛІН. З Канстантынопалю паведамляюць, што ў часе аварыі ў Чорным моры італьянскага судна «Клітуна» затанула 22 чал. 12 выратаваліся на румынскім беразе.

Зьмяя ў самалёце.

ЛЁНДАН, 3-I. Місіс Кейт Мілер і капітан Ляйкастэр, якія вылеценді паўтары месяцы назад у пералёт Англія—Аўстралія на авіятцы, заўважылі ў часе палёту з Рангуну ў Тавой (Індыя) вялікую зьмяю, якая заселла ў самалёт на апошняй стаянцы. З прычыны таго, што капітан Ляйкастэр быў заняты маторам, пазбавіцца ад атруднае зьмяі давялося яго надарожніцы, якая ўрэшце ўдала справілася за зьмяёю.

ЯШЧЭ ТЫСЯЧЫ БЕСПРАЦОЎНЫХ ГАРНЯКОЎ.

ЛЁНДАН, 28-12. У вугольным райёне Віган зачыніліся дзьве вугольныя капальні. Тысячы занятых у гэтых капальнях рабочых засталіся без працы.

2-я Сэсія ЦВК БССР VIII скліканьня.

Аб зьменах у складзе ўраду.

ПРАМОВА тав. ХАЦКЕВІЧА.

Таварышы! Паміж першай і другой Сэсіямі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР былі зьмены ў складзе ўраду.

Перш за ўсё, б. старшыня Савету Народных Камісараў БССР і член Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту тав. Адамовіч, Язэп Аляксандравіч, які доўга працаваў на Беларусі на рознай адказнай працы, як сябра Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР, атрымаў запрашэньне на адказную работу ў Маскву, у Вышэйшы Савет Народнае Гаспадаркі СССР, дзе ён цяпер і працуе.

У зьвязку з гэтым тав. Адамовіч, Язэп Аляксандравіч, падаў заяву ў Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР з просьбай аб аслабаненьні яго ад абавязкаў старшыні Савету Народных Камісараў БССР. Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту прыняў гэтую заяву і пасьля ўсебаковага абгаварэньня задаволіў просьбу тав. Адамовіча, аслабаніўшы яго ад абавязкаў старшыні Савету Народных Камісараў БССР.

Старшыня: Дазвольце, таварышы, пастанову Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту аб аслабаненьні тав. Адамовіча ад абавязкаў старшыні Савету Народных Камісараў БССР паставіць на галасаваньне. Хто за тое, каб зацьвердзіць гэтую пастанову—прашу падняць рукі. Хто супроць? Хто ўстрымаўся?—Няма. Прымаецца.

Тав. Хацкевіч: У зьвязку з аслабаненьнем ад абавязкаў старшыні Савету Народных Камісараў тав. Адамовіча, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту абраў старшынёй Савету Народных Камісараў БССР члена Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР тав. Галаведа, Мікалая Мацьвеевіча. (Воплескі).

Старшыня: Дазвольце, таварышы, гэтую пастанову Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту паставіць на галасаваньне. Хто за тое, каб зацьвердзіць тав. Галаведа старшынёй Савету Народных Камісараў—прашу падняць рукі. Прашу апусьціць. Хто супроць? Хто ўстрымаўся? — Няма. Прынята аднагалосна. (Воплескі).

Тав. Хацкевіч: Далей, таварышы, Народны Камісар Фінансаў БССС тав. Васілевіч, Іван Антонавіч, быў абраны сэкратаром Цэнтральнага Камітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі.

У зьвязку з гэтым ён падаў заяву ў Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту аб аслабаненьні яго ад абавязкаў Народнага Камісара Фінансаў БССР. Гэтае хадайнічаньне тав. Васілевіча Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту было задаволена.

Тав. ХАЦКЕВІЧ.

Старшыня: Стаўлю на галасаваньне. Хто за тое, каб зацьвердзіць пастанову Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту аб аслабаненьні тав **Васілевіча** ад пасады Народнага Камісара Фінансаў—прашу падняць рукі. Хто супроць? Хто ўстрымаўся?- Няма. Прымаецца.

Т. Хацкевіч: Пасьля аслабаненьня т. Васілевіча Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту назначыў Народным Камісарам Фінансаў БССР члена Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, які быў да гэтага часу Намесьнікам Народнага Камісара Фінансаў—тав. **Мікуліча**, Васіля Зьмітравіча.

Старшыня: Стаўлю на галасаваньне. Хто за тое, каб зацьвердзіць гэтую пастанову—прашу падняць рукі. Прашу апусьціць. Хто супроць? Хто ўстрымаўся?—Няма. Зацьвярджаецца.

Тав. Хацкевіч: Згодна пастановы Першай Сэсіі нашага ЦВК у складзе Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту павінна быць 15 членаў 6 кандыдатаў.

У зьвязку з тым, што са складу Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту выбылі т. т. **Адамовіч, Язэп Аляксандравіч, і Крыніцкі**, Аляксандр Іванавіч, у склад Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту прапануецца ўвесьці наступных таварышоў: **Васілевіча**, Івана Антонавіча—члена Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і **Каркліна**, Марціна Марцінавіча—Намесьніка Старшыні Савету Народных Камісараў.

Старшыня: Ёсьць якія небудзь заўвагі да гэтае прапановы? (Галасы—няма).

Галасую: Хто за тое, каб абраць т. т. **Васілевіча і Каркліна** членамі Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту—прашу падняць рукі. Прашу апусьціць. Хто супроць? Хто ўстрымаўся?—Няма. Прымаецца.

Тав. **Хацкевіч:** Па гэтым пытаньні ўносіцца праэкт наступнай пастановы (чытае).

Старшыня: Стаўлю на галасаваньне: Хто за тое, каб зацьвердзіць гэтую пастанову, прашу падняць рукі. Прашу апусьціць. Хто супроць? Хто ўстрымаўся?—Няма. Прымаецца (пастанова зьмешчана ва ўчарайшным нумары).

Пленум Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР.

Пленум Бюджэтнай Камісіі адчыніўся 3 га студзеня ў залі пасяджэньняў ЦВК і СНК БССР.

Пасьля кароткай прамовы старшыні Бюджэтнай Камісіі тав. Калініна і зацьверджаньня парадку дню і работы пленуму зрабіў даклад тав. **Матус** аб «папярэдніх данных Наркамфіну аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту БССР за 1926-27 бюджэтны год».

У спрэчках на дак аду на вячэрнім пасяджэньні выступалі т.т.: Наўлукевіч, Карнешын, Калнін і Пятровіч.

На пасяджэньнях 4 і 5 студзеня быў заслухан даклад тав. **Мікуліча** аб „бюджэце на 1927-28 год".

Даклад тав. Мікуліча.

Праэкт дзяржаўнага бюджэту БССР, які СНК БССР прадстаўляе на разгляд Бюджэтнай Камісіі, уключае ў сябе далучаную да БССР Гомельшчыну. Апроч таго, гэты праэкт бюджэту прадугледжвае ліквідаваньне 4-х округ.

Раней, чым распачаць тлумачэньне бюджэту на 1927-28 год, трэба спыніцца на прыбытковай частцы.

Прадукцыя сельскай гаспадаркі за год узрасла на 2,8 пр.; прадукцыя ўсяе прамысловасьці ўзрастае на 9,3 проц.; уся прадукцыя сельскай гаспадаркі і прамысловасьці—на 4,9 проц.; насрэдніцкі гандлёвы зварот узрастае на 10,6 проц.

Непадатковыя прыбыткі ад гадлю, банкаў і прамысловасьці складаюць 79,6 проц. Прыбытак прамысловасьці 27-28 году зьніжаецца ў абсалютнай сваёй суме. У параўнаньні з мінулым годам зьніжэньне цэн зрабіла ўплыў на паніжэньне зыску ў прамысловасьці, што адбіваецца на самым бюджэце. Прыбыткі ад лясоў па бюджэту складаюць 21.500.000 руб. ці 87,8 проц. бюджэту 1926-27 г.

Паніжэньне лясных прыбыткаў тлумачыцца тым, што амаль ва ўсіх лясных округах ёсьць гэтак званыя зьнельныя фонды, якія згодна пастановы ўраду БССР павінны быць высечаны ў працягу 3-х год і перададзены ў працоўнае карыстаньне сялянству.

Іншыя непадатковыя прыбыткі даюць рост на 46 проц., але, прымаючы пад увагу, што абсалютная сума іх нязначная, гэты рост не кампэнсуе зьніжэньня лясных прыбыткаў і прыбытку ад прамысловасьці. А таму непадатковыя прыбыткі ў сёлетнім годзе складаюць толькі 89 процантаў непадатковых прыбыткаў мінулага году, а ўсе дзяржаўныя прыбыткі складаюць 96,7 проц. мінулага году.

Сэсія ЦВК БССР, якая зацьвярджала бюджэт на 26-27 год, дала дырэктыву замацаваць гэткія суадносіны ў прыбытках (непадатковыя—61,7 пр., падатковыя—38,3 проц.). Аднак, мы бачым, што гэта дырэктыва парушана ў бюджэце на 27-28 год: замест 61,7 проц. удзельнае вагі непадатковых прыбыткаў мы маем у бюджэце 27-28 году толькі 56,6 проц., і адпаведнае павялічэньне ўдзельнае вагі непадатковых прыбыткаў з 38,3 проц. да 43,3 процантаў. Зразумела, у далейшым перад намі стаіць задача зноў павысіць удзельную вагу непадатковых прыбыткаў шляхам лепшага і больш правільнага выкарыстаньня і эксплёатацыі нашых лясоў.

Бюджэт на 27-28 год у абсалютнай суме збалянсаваны ў суме 63.147.000 руб., што дае рост супроць мінулага году на 22,8 проц., а калі ўзяць пад увагу, што мэліярацыйныя работы і пабудова будынкаў універсытэту ў Менску аднесена на Саюзны бюджэт і ня ўключаны ў наш бюджэт, увесь бюджэт складае 67.038.750 руб., што дае рост на 30,5 проц.

Калі мы зьвернемся да выдатковай часткі, як разьмярк ўваюцца выдаткі па галоўных прадметах прызначэньня, то ўбачым, што выдаткі па народнай гаспадарцы ўзрастаюць на 53,2 пр., складаючы абсалютную суму ў 23.085.194 р., выдаткі на сацыяльна-культурныя патрэбы ўзрастаюць на 11,4 проц., складаючы абсалютную суму ў 11.512.242 р.; выдаткі на дзяржаўныя кіраўніцтвы зьніжаюцца на 7,3 проц.; сродкі, якія перадаюцца мясцовым бюджэтам, зьніжаюцца на 8,1 проц., фонды на 48,8 проц. Калі ўзяць паасобныя галіны, то па НК Асьветы каштарыс расьце на 33,4 проц., у той час, як бюджэт дае рост на 22,8 проц.; рост асыгнаваньняў па прамысловасьці—на 131,9 проц.; на электрыфікацыю—на 124 проц. росту і на сельскую гаспадарку—36,8 проц. і г. д.

Асыгнаваньні на мерапрыёмствы па барацьбе з беспрацоўем узрастаюць на 42,8 проц. Калі летась мы мелі па барацьбу з беспрацоўем 840.000 руб., то на гэты год намячаецца 1.200.000 рублёў.

Для мясцовага бюджэту пры праэктаваньні дзяржаўнага бюджэту СНК устанавіў дапамогу ў выглядзе субвэнцыі ў 2.882.000 руб., якая разьмяркоўваецца наступным чынам: на зарплату настаўнікам—1.132.000 руб., з давядзеньнем ставак настаўнікаў да ставак РСФСР; на школьнае будаўніцтва—750.000 руб.; на шляхавае—900.000 руб.; на барацьбу з бясспрытульнасьцю—100.000 руб.

У спрэчках па дакладу выступаўшыя т. т. зазначылі наступнае:

Тав. Платун: П'камісія па прыбытковай частцы бюджэту, якая разглядала досыць дакладна прапануемы праэкт, у прынцыпе з гэтым згодзілася па ўсіх тых прыбытках, якія вызначаны па каштарысу. Трэба толькі адзначыць наступныя моманты: першы момант—тое, што каштарыс складзен, асабліва ў некаторых частках, досыць напружана; гэта напружанасьць будзе адчувацца, напрыклад, на нашай прамысловасьці і каапэрацыі.

Другі пункт, які ў нас выклікаў значнае сумненьне, гэта пункт адносна лясных прыбыткаў.

Трэці пункт датычыцца прамысловага падатку. Мы тут павялічылі прамысловы падатак на суму да 300.000 рублёў.

Наогул, усе зьмены, якія ўнесены п'камісіяй у прыбытковую часьць бюджэту, складаюць павялічэньне на 1.008.785 руб.

Тав. Хацкевіч: Трэба адзначыць, што бюджэт адпавядае тым дырэктывам, які былі дадзены да складаньня бюджэту. Тут мы маем даволі значнае скарачэньне адміністрацыйных выдаткаў і значнае павялічэньне выдаткаў на індустрыялізацыю, на прамысловасьць, сельскую гаспадарку і на культурна-сацыяльныя патрэбы. Але ёсьць шэраг момантаў, на якіх п-камісія не згаджаецца, уносячы свае папраўкі. Перш за ўсё ў праэкце бюджэту і ў пастанове СНК гаворыцца, што мы поўнасьцю выканалі дырэктыву і пастановы Савнаркому СССР аб скарачэньні адміністрацыйных выдаткаў. Па бюджэту значыцца, што мы скарацілі іх на 19,4 проц., а трэба скараціць на 20 проц.

Па думцы НК РСІ Саюзу выходзіць, што мы скарацілі гэтыя выдаткі толькі на 10,4 проц. Як бачыце, разьбежка не маленькая: 19,4 і 10,4 пр. Такім чынам, па думцы РСІ Саюзу, мы дырэктыву аб скарачэньні адміністрацыйных выдаткаў ня выканалі.

Таксама мы ў п-камісіі знайшлі, што ў выдатковай частцы бюджэту не выстарчальна адбіваецца выкананьне маніфэсту ЦВК Саюзу, а таксама пастановы Прэзыдыуму ЦВК і СНК БССР; невыстарчальна былі вызначаны неабходныя сумы на павялічэньне пэнсіі інвалідам. Мы лічым, што гэтыя сумы трэба павялічыць.

Далей, на землеўпарадкаваньне беднаты вызначаны невыстарчальныя сумы, якія патрэбны для дасканалага выкананьня маніфэсту і пастаноў нашага ўраду.

Таксама трэба адзначыць, што па нашым бюджэце ня вызначаны сродкі на мэліярацыю. Нам гэта трэба адзначыць і ўзбудзіць хадайніцтва, каб патрэбныя сумы былі ўключаны ў Саюзны бюджэт на мэліярацыю БССР.

Апроч таго, выступалі т. т. Валасевіч, Калнін, Пятровіч, Сьцепанюк і інш.

Выдзелена камісія ў складзе 9 чал. для выпрацоўкі праэкту рэзалюцыі. У камісію ўвайшлі т. т. Калнін, Хацкевіч, Шэршнёў, Платун, Элькінд, Сталяроў, Мікуліч, Вараўка і Браўковіч.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ПРЫБЛІЖЭНЬНЕ ЮРЫДЫЧНАЙ ДАПАМОГІ ДА НАСЯЛЕНЬНЯ.

Віцебск, 7-I. Акруговая пракуратура ўстанавіла штотыднёвы прыём і выдачу розных справак рабочым і служачым на прадпрыёмствах. Акрамя таго, устаноўлен вячэрні прыём рабочых і служачых у памяшканьні акруговай пракуратуры.

Прыёмы гэтыя будзе рабіць акруговы пракурор і яго памоцнік.

ПАШЫРЭНЬНЕ КРЭДЫТНАЙ СЕТКІ.

Рэчыца, 7-1. Крэдытная сетка райёну ня здольна здаволіць усе патрэбы насельніцтва. У зьвязку з гэтым прэзыдыум райвыканкому арганізоўвае яшчэ два таварыствы ў в. Засьпе, якое будзе абслугоўваць Засьпенскі і Сьвірыдовіцкі сельсаветы, і ў в. Дзямехах для абслугоўваньня Капаровіцкага і Ліскаўскага сельсаветаў.

ЭКСПОРТНЫЯ ЗАГАТОЎКІ.

Ворша, 7-1. Дняпрасаюз спажывецкае каапэрацыі ў першым квартале 1927-28 году праз пізаную сетку загатовіў для экспорту льну на 21.000 руб., пушніны на 5000 руб. і рызьзя на 8000 рублёў.

КРЭДЫТЫ НА ЗАГАТОЎКУ НАСЕНЬНЯ.

Полацак, 7-1. Полацкае акруговае таварыства сельска-гаспадарчага крэдыту ўжо атрымала з Белсельбанку 20.000 руб. на загатоўку насеньня да вясеньняй пасяўной кампаніі. Гэтымі днямі чакаецца дадатковае асыгнаваньне яшчэ 15.000 руб.

БУДЗЕМ БУДАВАЦЬ ШКОЛУ.

Халопенічы, 7-1. На бюджэту адпушчаны сродкі на пабудову ў м. Халопенічах будынку для 4-хкамплектнай школы. У бліжэйшым часе будзе загатоўлены лесаматар'ял, а сама пабудова распачнецца вясной гэтага году.

Голас працаўнікоў з месц.

(*Гутаркі з членамі ЦВК БССР*).

ТАВ. ШАБЕТА МАЦЕЙ.

(Селянін м. Ельск, Каралінскага р., Мазырскай акругі).

—Летась навальніца зьнішчыла ў нас амаль увесь ураджай. Бульба таксама вымакла. Зараз бяда з кормам для жывёлы. Калі ўзяць пад увагу, што ў Каралінскім райёне ўжо арганізавана адно буйнае малочнае т-ва і зараз арганізуецца яшчэ адно, то стане ясным, якое значэньне мае свайчасовы завоз вотрубей і макухі.

Нейкая недарэчнасьць існуе ў галіне загатоўкі некаторых відаў сыравіны. Чамусьці спажывецкай каапэрацыі не дазваляюць загатаўляць шчаціну і інш. прадукты, бо гэта нібыта функцыі с.-г. каапэрацыі. Селянін ня робіць падзелу дзейнасьці каапэрацыйнай сыстэмы; ён нясе ў бліжэйшую спажывецкую краму свой сырэц, бо ня ісьці-ж яму блізкі-сьвет з жменяй шчаціны шукаць краму с.-г. каапэрацыі.

Хто-ж ад гэтага выйграе? Бязумоўна, прыватнік, які скуплів тое, што проста лезе яму ў рукі.

Дрэнна абстаіць справа з разьмеркаваньнем лесу. Вельмі часта даюць лес, праўда бедняку, але такому, які яго не выкарыстоўвае і за маленькі барыш прадае заможніку, а бядняк, як быў з дзюравай хатай, так і застаецца.

ТАВ. ПАЎЛАЎ.

(Селянін Каменскага с.-с., Горацкага р.).

— У нашым райёне мала лясоў, а балот шмат. Лесу адпускаюць вельмі мала. Няхай-бы хоць разгарнулі торфаздабываньне, але гэта справа ў нас ня рухаецца з месца. Трэба абавязкова прысылаць інструктароў па распрацоўцы торфу.

Гора ў нас з хлебам. У нас быў летась значны недарод і бракуе аўса, жыта, а завоз вельмі пязначны. Цэны на жыта на вольным рынку хутка растуць. Каапэрацыя ня зусім доба спраўляецца з гэтай задачай і вось чаму: заможныя пайшчыкі с.-г. каапэрацыі бяруць хлеб з каапэрацыі і перапрадаюць яго на вольным рынку, а пакупцоў—колькі хочаш. На гэту справу трэба зьвярнуць пільную ўвагу.

ТАВ. ЗОСЯ ЗЯНЬКЕВІЧ.

(Старшыня Ляхавіцкага с.-с., Лепельскага р., Полацкай акругі).

Т. Зося Сяньковіч зусім яшчэ маладая дзяўчына; працуе яна старшынёй сельсавету з 1927 г. Да гэтага часу Зянькевіч была сэкратаром і членам сельсавету.

— Як адносяцца да вас мужчыны, ці ня грэбуюць вамі, што вы «баба» і ня зможаце быць «начальнікам»?

— Усяго было, але зараз таго няма. Спачатку сяляне паглядалі на мяне недаверліва, з нейкай падазронасьцю. І як магло быць інакш?

Зося Зянькевіч з в. Жгураўка, якая вырасла на іх вачох, раптам стала кіраваць сельсаветам. Жыцьцё паказала сялянам, што жанчына можа працаваць ня горш мужчыны.

Затое ад жанчын няма адбою: зараз на розных справах ідуць пераважна жанчыны.

— На што скардзяцца сяляне вашага сельсавету?

— Найбольш на недахоп лесу на будынкі і апал. У нашым сельсавеце нават балот няма, каб здабыць торф; дзеля гэтага нашаму райёну трэба зацікавіцца тым, каб адвесьці тарфянік для нас у іншым сельсавеце.

Што нас губіць, дык гэта напіраваемора, якое цячэ ў сельсавет з розных куткоў: тут і АВК, і РВК, і суд, і прафсаюзы, і інш. Усім трэба адказваць, трэба даваць розныя даведкі, а гэта адніма шмат часу; замест таго, каб ехаць талакой строіць дарогі, трэба сядзець у сельсавеце і пісаць адказы.

„На Лейне ўсё спакойна".

(*Ад нашага бэрлінскага карэспандэнта*).

Лейна. Прайшло ўсяго з дзесятак гадоў з таго часу, як быў заснаваны гэты вялізарны завод, а ўжо няма ў Нямеччыне ніводнага рабочага, які ня ведаў бы Лейны—«страшнай Лейны», „лейнскага пекла", лейнскай „дамавіны". Пра Лейну сьпяваюць песьні, пра Лейну складаюць лягенды.

«Лейна-вэркэ»—лейнскі завод—найбуйнейшае хімічнае прадпрыёмства Нямеччыны. У ім у сучасны момант пасьля ўсіх рацыяналізацый занята, водлуг афіцыйных данных, звыш 32.000 рабочых. Тэрыторыя заводу займае каля 40 квадратовых кілёмэтраў. Каля заводу пасажырскі поезд ідзе чверць гадзіны.

Лейна выробляе штучнае ўгнаеньне. За мінулы год было выраблена звыш 500 мін. тон азоцістага ўгнаеньня. Апроч таго, Лейна выробляе фарбы; за апошні год у яе дзейнасьці пачаў адыгрываць вялікую ролю выраб штучнага бензыну і нафты з бурага вугля.

У часе працэсу вырабу на заводе вырабляецца вялікая колькасьць удушлівых газаў, і ў выпадку вайны, Лейна мела зусім пераабсталяваца на выраб газаў і літаральна заліць імі ўсю Эўропу.

Прыбыткі Лейны, як і ўсёй нямецкай хімічнай прамысловасьці, вялізарныя.

Але Лейна займае слаўнае месца ня толькі ў нямецкай эканоміцы. Яе імя ўпісана искравымі літарамі ў гісторыю нямецкай рэвалюцыі. У 1921 г. Лейна была адным з центраў сярэдня-нямецкага паўстаньня.

Пасьля прыдушэньня гэтага паўстаньня рабочыя арганізацыі Лейны былі зруйнаваны, арганізаваныя рабочыя выкінуты з заводу. З таго часу Лейна—гігант са зьвязанымі рукамі. На заводзе працуюць амаль выключна фашысты, ці апалітычныя рабочыя, альбо тыя, каго адміністрацыя лічыць гэткімі. У Нямеччыне ведаюць аб нячуваных умовах працы на Лейне, але дзьверы заводу зачынены для чужых.

Ужо шмат гадоў ніводзін журналіст, ніводзін абсьледвацель не пераступаў парогу фабрыкі.

І вось нядаўна адбылася сэнсацыя. Спрытны журналіст—супрацоўнік левай буржуазнай газэты „Бэрлінэр Тагеблят"—здолеў пашасьці на Лейну ў якасьці рабочага і прапрацаваў там каля шасьці тыдняў у розных аддзяленьнях. Свае ўражаньні ён апісаў у выключна цікавым артыкуле.

„Бэрлінэр Тагеблят" зараз, перад надыходзячымі выбарамі, узяў наогул досыць бравурны левы тон і таму, відаць, ня вельмі зьмягчаў ураджаньні свайго супрацоўніка.

Артыкул выкрывае жудасны малюнак жыцьця лейнскіх рабочых. Дакладны допыт пры прыёме—пытаньні аб прыналежнасьці да прафсаюзу, да палітычнай партыі; заводзкая паліцыя, якая сачыць за кожным крокам рабочага; зьняважлівыя вобыскі пры выхадзе з працы. Рацыяналізацыя, выматваючая ўсе сілы, вельмі дяжкія штрафы за найменшае ўхіленьне ад правіл, за лішняе слова, сказанае таварышу ў часе працы, за „непатрэбнае" мыльцё рук, за тое, што затрымаўся на сваёй справе. Штрафы вельмі высокія. Рабочы ўвесь час знаходзіцца ў варунках небясьпекі атручаньня. Вельмі часта прыходзіцца ўсім упякаць з аддзяленьня, дзе раптам разьлівацца газ, але гэта ня выратоўвае: газ выпераджае ўцякаючых, і яны досыць яго надыхаюцца, рэдкі чымся нападаць у безапаснае месца. Ня гледзячы на напружаньні, на ўсякія прадпісаньні і правілы, выпадкі атручэньня досыць частыя. Жыльлёвыя ўмовы вельмі дрэнныя. Кватэр каля

Па чатырох краінах.

(Уражаньні і сапраўднасьць).

Парыскія музэі: Люксэмбурскі, Родэна, Клюні і музэй Рэвалюцыі.

Для Луўра мы аддалі тры дні. Каля пятнаццаці гадзін абходзілі яго аграмадныя залі, галоўным чынам, карцінную галерэю і ўсё яшчэ не пасьпелі ўсяго агледзець. Наш прысьпешаны абход яго на даў, таксама, падрабязгова спыніцца на яго многатысячных, часта сьветавых экспанатах. Калі бы мы паставілі сабе мэту дасканалага вывучэньня Луўру, нам не хапіла бы часу ня то што на агляд іншых музэяў, а і мала было бы ўсяго тэрміну, не які мы мелі дазвол быць у Францыі. Трэба было пасьпяшаць, каб хоць ня зусім грунтоўна, а пазнаёміцца з цэлым шэрагам знатных установ і гістарычных помнікаў Парыжу. Усё-ж, маючы гэта на ўвазе, нам шкода рабілася расставацца з Луўрам, выходзячы з яго ў апошняе наша наведаньне. Нейкая асаблівая сіла зачараваньня цягнула нас туды, колькі бы разоў мы ні праходзілі міма Луўру. Я помню, што ніводзін музэй на мяне не зрабіў гэткага моцнага ўражаньня, як Луўр.

А розных музэяў даводзілася мне бачыць ня мала. Сярод іх многа багатых і знатных, як: Эрмітаж, Рускі музэй (Ленінград), Трацьцякоўская галярэя, Румянцаўскі музэй (Масква), Нацыянальны музэй (Прага-чэская), музэй Фрыдрыха, музэй—дварэц, Нацыянальная карцінная галярэя (Бэрлін), Мюнхэнскія музэі і багацейшая карцінная галярэя Дрэздэну (Zwienger) з яе багатым зборам класікаў і з яе Сікстынскаю мадоннаю Рафаэля,—але ўсе яны многім уступаюць Луўру. Тут ужо, сапраўды, сканцэнтравана грунтоўнасьць францускага размаху!.. Прыклады апошняга мы далей сустракалі многа разоў, аглядаючы шэраг достопрыметнасьцяй Парыжу. І аглядаючы, мы ня раз вароча́ліся да параўнаньня Парыжу з Бэрлінам, у скутку якога (параўнаньня) у нашым разуменьні францускі размах сваімі дадатнымі бакамі пераважваў нямецкую педантычнасьць...

Але гэтага ня відаць было, калі мы трапілі ў Люксэмбурскі музэй. Гэта зусім невялікі, хоць і надзвычайна прыемны па свайму абсталяваньню і разьмяшчэньню экспанатаў музэй.

Ён займае некалькі нязлых пакояў вядомага Люксэмбурскага палацу. Адзін пакой, уваходны, са шкляным верхам, адведзены над скульптурнае аддзяленьне музэю. Яквуратна, стройна ў тры рады растаўлены ў ім белыя, як сьнег скульптурныя працы з мармуру. Да сотні паасобных фігур і групаў, адна другое цікавейшых, сустракае вас пры ўваходзе ў музэй. Цёмныя фарбы сьцен адбіваюць, рэльефуюць прыгожыя постаці статуй, на кожную з якіх можна глядзець гадзінамі. Сярод іх багата здольных твораў, у большасьці пазьнейшага часу. Мы разважней азіраем кожную рэч, карыстаючыся тым, што ня зусім значны іх лік дасьць нам магчымасьць на працягу чатырох-пяці гадзін абглядзець поўнасьцю далёка меншы ў зроўні з Луўрам музэй.

Больш выдатныя творы займаюць нашу ўвагу надаўжэй. Вось група Д. Puech—«Сірэна».

Казачная багіня са скрыдлямі і рыбнымі хвастамі замест ног, абнімае за нояс цыгожую асобу на паўдзяўчыну, на паўмужчыну. Колькі эротычнай падатлівасьці і адначасна цнотлівай чыстасьці ў яе істоце! Вунь «Раніца» H. Lemaire. Бесклапотная дбайніца чыстасьці нядбайна, у расплыўнай утоме заплятае памытыя косы. Сонца кунае яе здаровае цела ў сваіх цёплых прахеньнях.

Многа жыцьця, многа сілы і здароўя... Далей стройная, музычная «Галатэя» Margueste.

Ідэал жаночага хараства, задрамаўшая ў прагным хваляваньні. Margueste—мастак лаўрэат—honore. Поруч з ім G. Michel са сваею «Dang le Rêve»—тая ж ідэя, той жа настрой, толькі фоўка жаночых формаў...

Наогул—жаночы род прэваліруе ў прадстаўленых скульптурных працах. Дзясяткі адценьняў у настроях пры ўважлівым, заціжным любаваньні кожным мастаком надворнага выгляду свае гэраіні. Сум, жуда, разуверра, жаданьне, імкненьне—вось тэмы, на якія выпаўнены ў большасьці дасканала цікавыя творы. Сярод іх трапляюцца, зразумела, і іншыя па зьместу працы. Але на грамадзянскія тэмы заўважваеш лічаныя экспанаты...

Ад скульптурнага аддзяленьня музэю мы пераходзім у карцінае. Тут выключна сучасныя творы. У Луўры пад іх адведзена з пяць невялікіх пакойчыкаў на трэцім паверху, у кутку.

Невялікі іх збор параўнаўча са старэйшым мастацтвам зрабіў на нас нявыгаднае ўражаньне. Мы не знайшлі ў ім нічога гэткага, на чым бы можна было спыніцца.

Стракатыя, празрыстыя камякі зялёнай і рыжовай фарбаў, цьмяныя, крывыя і вуглаватыя твары, сьведчачы аб экстрэмістскіх, футурыстскіх і кубістскіх плынях у сучасным францускім мастацтве, наводзілі нас на пэссымістычныя вывады. Мы ўжо складалі адмоўную думку аб сучасным францускім вобразным мастацтве, якога не вызбаўляла агульнае багацьце Луўру.

Аднак Люксэмбурскі музэй разсеяў гэты наш настрой. У ім мы знайшлі багаты збор твораў сучасных францускіх мастакоў. Сярод іх досі многа, на нашаму густу, таленавітых, выдатных твораў. Праўда, і ў Люксэмбурскім музэі, як і ў аддзеле сучаснага мастацтва Луўру, ня мала ўзораў асаблівай модэрністкай цечыі. Тыя-ж колекі, паўлюдзі, паўздані кабеты, крыватварыя, рахітычныя дзеці, ляндшафты з надмерна зялёным небам і сінімі садамі, ніснуючыя ў сьвеце выгляды садавіны і гародніны і інш. цуды. Але тут шмат і гэткіх вобразаў, на якія вы глядзіце чуць-чуць ня з гэткім настроем і ўвагаю, як на Джыаконду Леонарда-да-Вінчы... Прынамсі маім сябрам Міхасём Люксэмбурская карцінная галярэя, як і ўвесь Люксэмбурскі музэй, спадабалася.

Я заўважаў, што Галатэі і Сырэны затрымлівалі іх каля сябе на столькі часу, у які ханала наглядзецца і нацешыцца імі.

Жаночага роду ханала і ў карцінным аддзеле... Трэба сказаць, што гэты жанр, калі судзіць па Люксэмбурскаму музэю, асабліва густуецца францускімі мастакамі.

У кожнай каморцы, адведзенай пад карціны, мы заўважалі вялікую колькасьць апошніх, прысьвечаных тэме аб жанчынах. Тут ёсьць: «Флорэаль» Р. Коллена, «Сьпячая куртызанка» Г. Отмана, «Адначынак» Г. Лебаса, «Маладзіца з садовінай» К. Дзелявіля і інш. Пры гэтым мастакі не прызнаюць ніякіх фігавых лісткоў; гэраіні іх вобразаў у чым маці нарадзіла. Усяго над чым яны папрацавалі—гэта над паказам гледачу тых позаў, у якія толькі фантазыя мастака можа палажыць свайго гэроя... З іншага зьместу вобразаў трэба адмеціць арыгінальныя працы мастака К. Кар'ера—„Сям'я" і інш., якія напісаны ім цьмянымі фарбамі пад лёгкім шэрым дымком, з-пад якога твары асобаў выглядаюць мярцьвяна-сумнымі—а таксама праца Р. Вуга «Маленькая дзяўчынка з лялькаю» і інш. У огуле Люксэмбурскі музэй пакінуў на нас здавальняючае ўражаньне.

Асабліва М. Зарэлкага ён да таго заханіў, што наш сябра знарок схадзіў у яго двойчы, каб купіць на ўспамінак альбом яго фототыпіяў...

Пасьля Люксэмбурскага музэю музэй Родэна не зрабіў на нас значнага ўражаньня. Праўда, мы зацікавіліся арыгінальнасьцю работаў гэтага мастака, як бы намёкамі ўводзіўшых нас у глыбокі сэнс аўтарскіх задумаў. Усё-ж вытачаныя абрысы фігур, моцна выходзячых у глыбы натуральнага дзікага мармуру, надавалі ўражаньне недакончанасьці і неэстэтычнасьці надворнага боку твораў. Але, па ўсяму ліку паасобных твораў, запаўняючых залы, хоць і невялічкі музэйчык, можна заключыць, што таленавіты мастак Родэн і ня гнаўся за формаю. Яго мэтаю было вылавіць у агульных рысах сутнасьць укладзенай у той ці іншы твор ідэі. Калі судзіць па рознастайнасьці тэм і па колькасьці паасобных твораў Родэна—трэба згадзіцца, што яго таленавітасьць мяжуе з гэніяльнасьцю...

З рэштай музэяў цікавым зьяўляецца музэй Рэвалюцыі. Адну палову гэтага музэю займаюць дакументы, малюнкі, розныя рэчы і рэліквіі дарэвалюцыйнае, абсалютыскае Францыі: ўбёры каралёў, прыдворных, начальнікаў, сялян і рамесьнікаў сямнаццатага і пачатку восемнаццатага веку; пляны Парыжу, модэлі каралеўскіх палацаў... Другая частка адведзена пад помнікі часоў Вялікае Францускае Рэвалюцыі. Тут сабраны партрэты выдатнейшых рэвалюцыянэраў (Дантон, Марат, Робесьп'ер, Сэнжуст і інш.), граматы і акты, сьцягі, з якімі ішлі паўстанцы на разбурэньне Бастыліі, модэлі гільотыны, малюнкі, на якіх паказана сьмертаваньне Людавіка XVI і Марыі Антуанэты. Асобная салька прысьвечана цалкам Бастыліі. У ёй знаходзяцца: модэль гэтае страшнае крэпасьці-турмы, замкі ад варотаў у яе, прылады, якімі катавалі заключных, кайданы, наручнікі з нашэйнікамі разам. У гэтай жа салі хаваюцца і косы апошняга перад рэвалюцыяй францускага караля, і цэлы шэраг іншых рэчаў. Аднак сам па сабе гэты музэй накідае зусім ня тое ўражаньне, якога ад яго чакаеш, ідучы на агляд. Заўважваецца беднасьць, шэрасьць і непаўнота прадстаўленьня аб векапомнай гістарычнай эпосе...

Музэй Клюні зьмяшчае ў сабе розныя старасьвецкія рэчы рэлігіезнага культу. У ім сабраны рэзныя працы па дрэву, мэталічныя саматужныя вырабы іконаў, ліхтарняў, ліхтароў, крыжоў. Чамусьці да гэтых «сьвятых» экспанатаў дададзена шмат саматужных пасудных вырабаў з гліны і фарфару... Музэй Клюні характэрны тым, што ён зьмяшчаецца ў многавяковым музэйным будынку, знарок захаваным на працягу доўгіх гадоў, як помнік старасьветчыны.

Прызнацца, гэтаму музэю мы ўтраіх, як па згодзе, шкадавалі прысьвяціць і таго невялікага кавалку часу, які ён ад нас адабраў. У ім мы не знайшлі нічога гэткага, на чым бы можна было спыніцца і з чым можна было пазнаёміць чытача.

Заходу ў яго мы павінны былі нашаму гіду-перакладчыку, які, па чутках ад другіх, меў аб музэі Клюні добрую думку. Па агледзе, аднак, ён згадзіўся з намі, што гэты музэй мала цікавы... «Але,—апраўдваўся ён:—паглядзелі—будам мець уражаньне аб ім і ня будзе рупець, што не наведалі».

З гэтым нельга было не згадзіцца, тым болей, што справа ўжо асталася паза зе. Наперадзе сталі ў чаргу, чакаючы нас: Сабор Парыскае божае маткі, Пантэон, Дом Інваліда, Трыумфальная арка і могілкі Пэр-Ляшэс.

(Далей будзе).

З. ЖЫЛУНОВІЧ.

ГАДОЎ ПРАЗ ПЯЦЬДЗЕСЯТ.

(Не фантазія).

Пераклад з украінскае мовы.

Дзед Яўхім ну ні на от-столечкі ня верыць у новыя парадкі... Ну ніяк...

Калі-б я з ім ні сустрэўся, ён заўсёды і абавязкова чухае патыліцу і кажа:

— Нарабілі?! Ну, скажыце, навошта гэта ўсё? Каму яно патрэбна?

Жылі-ж калісь... Жылі-б і далей... А цяпер...

І пайшоў, і пайшоў, і пайшоў...

Дзеда Яўхіма я даўно ведаю, і даўно ён такі. Ён яшчэ, мабыць, з дзяцінства вораг усяго новага...

Калісь яшчэ, як праводзілі ў вольасьці тэлефон, ён лаяўся страшэнна і крычаў:

— Пасляку! Слупы пасляку!

— А навошта вы іх, дзядзька, будзеце сячы?

— Каму яно тут патрэбна? Ям панакопвалі. Еду я са станцыі ўвечары, людзей вязу, на двары цёмна! Я іду сабе каля возу, а яно цёмна, хоць у вока страляй...

Дык я як шарахнуў у тую яму, дык думаў, што на той сьвет лячу. Што напалохаўся, а што зьбіўся, дык і не давядзі божа! А вы кажаце: «тэлефон»... Вось вам і тэлефон... То ямы былі—падаў у іх, а цяпер слупы—чапляешся возам за іх, воз ламаеш... Сьмяцеся?! А яно, далібог, каб ведаў, што не адказваць, насек бы тыя слупы на трэсачкі...

З дзедам Яўхімам цяжка гаварыць, бо ніякія довады ня ў сілах пераканаць дзеда Яўхіма.

На ўсё, што яму ні кажаш, дзед Яўхім махае рукой:

— Глупства!

Вось такі дзед Яўхім...

* * *

Эх, дзяды Яўхімы, дзяды Яўхімы! Чым-жа вам давесьці, што за дзесяць год рэвалюцыі жыцьцё палепшала? Як жа вас пераканаць, што далей яно будзе яшчэ лепшым?

Трактар—глупства.

Днепрабуд—глупства.

Асьвета—глупства...

Электрыфікацыя—глупства,

Усё, адным словам, глупства.

Я калісьці два дні расьпінаўся перад дзедам Яўхімам, даводзячы яму, як будзе цудоўна жыць, калі сацыялізму дасягнем.

Не ўзяло.

—Што ты мне пра сацыялізм намёкваеш? Што ты мне электрыку, што ты мне радыё?! А зямлі мне твая электрыка дасьць? Каб дзесяціну па дзесяць на едака? Дасьць яна мне зямлі столькі ці ня дасьць?! Вось гэта мне скажы! Каб у мяне ў засеках поўна было... А ты мне электрыку. Пасею я на тваёй электрыцы арнаўтку, каб потым, паклаўшы рукі за сьпіну, хадзіць ды пасьмейвацца?! Вось ты мне што скажы.

Я тады зазлаваў на дзеда і нічога не сказаў...

Я цяперь вось для ўсіх дзядоў Яўхімаў раскажу, як яно ў нас будзе, калі будзе ў нас электрыка... Як мы будзем жыць, калі скрозь у нас будзе:

— Савецкая ўлада плюс электрыфікацыя.

* * *

Слухайце, дзяды Яўхімы! Для вас спэцыяльна.

Вам добрага жыцьця хочацца?

Я ведаю якога.

Яно—будзе! Будзе яшчэ лепшае, як вы думаеце.

Слухайце.

Калі правядзем скрозь электрыфікацыю, калі ў кожную савецкую хату будзе праведзены дрот, калі дротамі тымі прасторы нашы заспуюцца, вось тады ўсе вы, дзяды Яўхімы, будзеце толькі, заклаўшы рукі за сьпіну, пасьмейвацца.

Усё за вас будзе электрыка рабіць.

Вось вы ўсталі з ложка. Вы цяпер што робіце? Чухаеце патыліцу, грудзі. Трэба для гэтага даставаць рукою скрозь, дзе сьвярбіць. Ёсьць такія месцы, што і дастаць ня можна. А тады савецкая ўлада прыдумае такое пакшталт рукі, кнопку націснуў—яна табе чухае... І такі апарат будзе, што як на яго ляжаш, дык ён сам цябе будзе пераварачваць, а рука будзе чухаць. І скрозь, скрозь пачухае. Не застанецца ніводнага нявычуханага месца.

Як ужо яно вас пачухае, тады вы выцягваеце ногі, паціскаеце кнопку, і штаны самі на ногі лезуць, самі анучы накручваюцца і боты адзяюцца. Вам нават нахіляцца не давядзецца.

Апранула вас электрыка, тады вы становіцеся перад абразамі. Пускаеце радыё, гучнамовец за вас малітвы чытае, а электрыка руку вашу падымае на лоб, на жывот, на плечы. Хрысьціць вас электрыка.

Гэта, так званае, электрыфікаванае «Ойча наш».

Паэлектрыфікаваўшыся богу, сядаеце за стол.

Ваша справа толькі рот разьзяўляць ды загадваць жонцы:

— Пацісьні кнопку з перапечкамі...

— Пацісьні на сала!

— Цяпер на сьмятану... Ды ня цісьні ты так доўга, бо глытаць не пасьпяваю. Цісьці кораценька.

Паэлектрасьнедаўшы, вы робіце тое, што вам трэба рабіць.

А рабіць вам толькі і таго, што кнопкі скрозь паціскаць.

Усё па гаспадарцы на кнопках.

Чысьціце вы, напрыклад, хлеў для каровы, адна кнопка вілямі кірує, другая лапатаю, трэцяя граблямі.

Не стаіць карова,—тыц у кнопку, а рычаг сам карову па рэбрах—лусь!

Усіх драбніц па гаспадарцы не пералічыш. Ведайце адно, што на ўсё будзе свая кнопка.

Вы будзеце толькі хадзіць ды пасьмейвацца.

Кубы для самагону і тыя будуць электрыфікаваныя. І бяз усякага дыму. Міліцыя нават не здагадаецца дзе гэта гоняць.

У кутку будзе электрыфікаваны дубец для дзяцей.

Уставіў штэпсэль,—дубец дзяцей лупіць, а гучнамовец лае.

Электрыфікуем гарбузікі—самі будуць у рот скакаць.

На што ўжо грабень, каб шукацца, і то будзе электрыфікаваны. Сам валасы разгартае, сам і паразытаў зьнішчае. Ваша справа будзе толькі перакручвацца.

Разславаліся на жонку, падвялі яе да спэцыяльнага апарату, націснулі кнопку, адтуль выскаквае качалка і жонку па галаве.

Я ўжо ня буду гаварыць тут пра асноўную работу нашу на вёсцы...

Само сабою разумеецца, што ворава, і касавіца, і жніво і малацьба, і памол—усё гэта будзе рабіць электрыка.

Ужо гэта там-сям і ёсьць у нас, а тады будзе скрозь...

Мы досьвіткі і тыя электрыфікуем. Будуць вынайдзены такія апараты, якія самі за вас будуць ў падкіднога дурня гуляць.

Паціснуў кнопку,—і вылятае або віновы туз, або там крастовая шасьцёрка, картамі нават лянаць не давядзецца.

* * *

Яшчэ-ж не забывайма, што электрыка ня простая рэч, яна рэч моцная, магутная.

Яе і ўрахоўваюць не абы як, а на конскія сілы. Дзьве конскія сілы, тры конскія сілы і г. д.

Днепрабуд, напрыклад, будзе даваць нам энэргіі на 650.000 конскіх сіл.

Качалку, каб біць жонку, разумеецца на поўмільёна конскіх сіл мы ня зробім,—гэта вельмі вялікая качалка будзе...

На дзьве конскія сілы, ня больш, зробім такі апарат.

Як дзьвіне—дык нібы дзьве кабылы жонку ўдарылі.

А цяпер што? Кулаком стукнулі, ды яшчэ да таго і п'яным кулаком, якая там сіла.

І ня слухаюцца бабы, на дэлегацкія сходы ходзяць, у хату-чытальню ходзяць...

А тады трасцы хадзіцьмуць.

Будуць слухацца. Гвалтам, але слухацца будуць.

І дзеці будуць слухацца.

І думаць нам з вамі ні пра што ня трэба будзе: і думаць і рабіць за нас будзе электрычная кнопка...

* * *

Вы ўяўляеце сабе, дзяды Яўхімы, электрыфікаваны, напрыклад, кірмаш?

Там ня будзе коняй. Коняй жа наогул тады ў нас ня будзе, бо ўсё будзе рабіць электрыка.

Мы будзем гандляваць тады электрычнымі кнопкамі.

Там, дзе ў нас цяпер па кірмашох коні стаяць, тады ў два рады, па гэты і па той бок дарогі, будуць стаяць электрычныя кнопкі.

Ня будзе ні іржаньня, ні пугі.

Проста вы сабе падыходзіце:

— Колькі каштуе гэтая кнопка?

— Гэтая сто дваццаць.

— Сто дваццаць?! Такая нікчэмнасьць, а такія грошы... Што-ж яна ў цябе такога робіць?

— Нікчэмнасьць?! Вочы ў цябе нікчэмныя!

Да ты прычапі да яе воз, або плуг, ды пагладзі, а тады кажы: «Нікчэмнасьць». Гэтая кнопка не з якой небудзь там паганенькай майстэрні, а з самога ДЭ'у *). Ты паглядзі лепш, што гэта за кнопка! Ды ніколі ў сьвеце я-б яе не прадаў, але грошы трэба: дачку замуж аддаю.

— Маліся богу! Бяры восемдзесят. І то грошы.

— Восемдзесят кажаш? За такую кнопку восемдзесят? Ён кажа за восемдзесят! Хрысьціся! Менш, як сто пятнаццаць і гаварыць ня будзем!

Лясь! Лясь! Лясь!

Вось такія тады ў нас кірмашы...

* * *

А храмы?!

Электрычныя званы на царкве.

Гучнамоўцы «Іжэ херувімы» сьпяваюць...

А бацюшка толькі ходзіць ды кнопкі паціскае...

А пасьля храму—электрыфікаваны пірагі, гарэлка, капуста.

Ёж, не хачу!

Падпіў у кума ў сьвята, штэпсэль табе ўставіць—ён цябе сам і да хаты правядзе.

* * *

Няўжо-ж і такое жыцьцё вам будзе не да спадобы, дарагія дзяды Яўхімы?

Няўжо ж і тады казаць мецце:

— Глупства?!

Эмектрыка-ж за вас і рабіць будзе, за вас і думаць будзе.

* * *

Улада—у нас!

Зямля—у нас!

Паноў—няма!

Трактары і машыны ўжо грукацяць на нівах.

А вы ўсё:

— Глупства!

Ня можна ж усяго адразу.

Пачакайце трохі— і будзем мець усё тое, што я вось тут намаляваў.

Нічога ня будзеце тады рабіць—толькі пакрэктываць.

АСТАП ВІШНЯ.

*) Дзяржаўны Электр. Завод.

АВАНЕС АВАНІСЯН.

Зярно.

Сьвітае. У поле пара ўжо даўно!
Вострым плугам зямлю я ўзару,
ніве аддам залатое зярно
да сонечных дзён ураджаю.

Цябе закапаю,—дый гора сваё,
як доля ня ідрадзіць,—ты станеш,
нарэ над зямлёю хай гора маё,
ты станеш пяць аб каханьні.

Калі-ж тваёй ласкі за ўсё за грахі
ня буду я варты, ваяўмуся ня мала—
я мора далью сваім потам пяжкім,
каб зярно маё смагі ня знала.

Красуй, расьцьвітай! Дарагое, красуй
залацістаю фарбай заранкі.
І тады дай разьбітаму сэрцу майму
любы сон, ціхі сьпеў калыханкі.

Пераклад з армянскае мовы.

Вёска.

Завіруха пяе за дзьвярыма.
Ад марозу—
трашчыць недзе лёд.
Ля кудзелі працуе дзяўчына—
Манатонна гудзіць калаўрот.

Думкі цягнуцца доўгаю ніткай,
Роўна круціцца верацяно.
...Дзесьці ў полі
зялёныя сьвіткі—
над пуховаю пеляной.

У пячурцы—калматы, вялікі,
нешта муркае
ў заціішны кот.
І падобны апосталаў лікі
Да нахохліўшыхся гракоў.

Ціха дрэмлюць пад печкаю куры,
толькі певень
драмаць ня прывык!
На двары-ж сьнегавыя віхуры
Заглушаюць і стон, і крык...

На палацях дзядуля старэнькі
насылае скаргі зіме.
З камяльку,
дзе палаюць карэньні,
нібы чуецца тонкі сьпеў...

Але—
сіла чароўнага часу!—
Нешта кранула дзедавы сны,—
і налева ад цьмянага Спасу
Варашылаў глядзіць са сьцяны!

Насупроць Варашылава—Рыкаў.
А на чыстым,
хоць скрыўленым, слонцы—
разгарнуты «Сымон Музыка»
на дваццаць другой старонцы!

Хутка поўнач. Дзядуля сьпіць...
У кутох—
нявыразныя цені...
Недзе ў клеці чакае вясны
Канюшынавае насеньне.

31-XII—27 г. **Юр. Лявонны.**

Бібліаграфія.

КАМСАМОЛІЯ. Зборнік. Выд. „Чырвоная Зьмена". Менск, 1927г. Стар. 74. Цана 50 к

У зборніку „Камсамолія" зьмешчаны выбраныя творы беларускіх пісьменьнікаў аб жыцьці, барацьбе камсамолу, аб удзеле яго ў сацыялістычным будаўніцтве.

Тут мы чытаем вершы Янкі Купалы, Чарота, Дудара, Вольнага, Александровіча і апавяданьні Тараса Гушчы, М. Зарэцкага, Бядулі.

„Камсамолія", бязумоўна, патрэбная кніга для шырокіх колаў рабоча-селянскае моладзі. „Камсамолію" будуць чытаць.

Але для таго, каб больш зацікавіць камсамольцаў гэтым зборнікам, зусім ня шкода было-б даць прадмову, у якой ахарактарызаваць роль камсамолу ў будаўніцтве беларускай пралетарскай літаратуры. Варта было-бы пагаварыць у папулярных рысах аб сучасным стане беларускай літаратуры, і гэта надало б зборніку большую вартасьць.

Было-б значна лепш, каб пры складаньні зборніку прытрымліваліся пэўнай сыстэмы: у зборніку матывы грамадзянскай барацьбы ідуць пасьля матываў удзелу камсамолу ў сацыялістычным будаўніцтве і г. д.

Але ўсё-ж гэты зборнік трэба распаўсюдзіць па камсамольскіх ячэйках, на хатах-чытальнях, школах і г. д. Ён адыграе пэўную выхаваўчую ролю. Адно шкода, што зборнік дорага каштуе, хаця-ж ён цікавы і патрэбны.

Р. А.

Тодар Глыбоцкі.

З літаратурнага блёк-ноту.

Ґаманіць—галава не баліць.

Адзнай з нашых папярэдніх заметак нам давялося спыніцца на адной вельмі нашыранай у нас катэгорыі людзей. Гутарка ішла пра мяшчан, пра «тутэйшых», пра тых, хто нацягвае на сабе марксыцкі халат, каб захаваць сваю ідэйную недалужнасьць, сваё моральнае калецтва ад людзкога вока. Абмежаванасьць месца не дазволіла нам тады ў належнай меры дыферэнтаваць катэгорыю «тутэйшых» па галінах іх выяўленьня, правесьці паасобныя прыклады іх «рукапрыкладзтва» ў паасобных галінах нашага будаўніцтва. Мы маем на ўвазе сягоньня спыніцца на адным з пахабнейшых выступленьняў такога гатунку ў галіне літаратурнай крытыкі.

Адным з выдатнейшых прадстаўнікоў новага пакаленьня ў беларускай літаратуры зьяўляецца Андрэй Александровіч. За 5—6 гадоў сваёй літаратурнай працы ён здолеў высунуцца ў першыя шэрагі беларускіх пісьменьнікаў. Яго творы пераклазены на украінскую, расейскую, часкую ды, іншыя мовы, на Беларусі карыстаюцца вялікай папулярнасьцю і маюць ужо цэлы шэраг пасьлядоўцаў з літаратурнай моладзі. Яго творы прадстаўляюць значную цікавасьць як па матывах, якія зьяўляюцца зусім новымі ў беларускай літаратуры, так і па форме багатай і ўдасканаленай, хаця пазту ніколі не даводзілася вывучаць пытаньні тэорыі літаратуры ў розных спэцыяльных вучэбных установах.

Усё, што мы адзначылі ў творчасьці А. Александровіча, даволі ўжо ўсім вядома і ўсімі прызнана, так што ў далейшым мы ўжо ня будзем болей на гэтым спыняцца. Але ў апошнім (5) нумары «Узвышша» зьявіўся нагромны артыкул*) нейкага К. Кундзіша (вядомага ўжо нам па хуліганскаму выступленьню супроць Ц. Гартнага), які з пенаю каля роту накінуўся на апошні зборнік А. Александровіча «Угрунь» і, стаўшы ў позу ортодоксальнейшага марксіста, ушчэнт разматлашыў гэты зборнік.

Калі глядзець на творчасьць Александровіча праз кундзішавы акуляры, дык можна проста дзіву дацца, як гэта такі небясьпечны суб'ект, як Александровіч, ды вольна гуляе па менскіх вуліцах. Сапраўды, тон узяты грам. Кундзішам у адносінах да Александровіча вельмі нагадзе грыбаедаўскае:

> Строжайше-б запретил я этим господам
> На выстрел подъезжать к столицам.

Каб ня быць галаслоўнымі, мы дазволім сабе прывесьці некаторыя паасобныя палажэньні гэтага грамадзяніна. Узяўшы паэму Александровіча «Дваццаць», якая вельмі добра малюе нам жыцьцё хланца з сям'і гарадзкога саматужніка**), Кундзіш па ўсіх правілах гэту паэму агвалціў і з гэтага зрабіў вывад, што: 1) Андрэй Александровіч—менчанін; 2) Андрэй Александровіч—нагромшчык і [illegible] (крымінальная справа! Т. і [illegible]); 3) Андрэй Александровіч—алкаголік і 4) Андрэй Александровіч—мала ня контр-рэвалюцыянэр. Усё гэта Кундзіш падмацаваў жывасілкам нацяганымі з паэмы радкамі, а каб надаць сваім вывадам больш саліднасьці і непагрэшнасьці, рашыў бліснуць сваім «марксычмам» і разрадзіўся гэткім пэрлам:

> „Той пласт гарадзкое грамады, з якога вышаў Александровіч і які ён зараз аллюстроўвае ў сваёй творчасьці, зьяўляецца міжлогным паміж пролетарыятам і буржуазеяй, гэта тое, што звычайна завецца мяшчанствам.
>
> Не даводзіцца спрачацца з тым, што мяшчанства перад рэвалюцыяй сваімі ўнутранымі сымпатыямі і экапамічна бліжэй за ўсё прымыкала да буржуазеі. Буржуазея карысталася мяшчанствам, як тэй масай, якой яна магла запаўняць, кітаець і запаўняла той востры і шырокі разрыў, што ўтварыўся быў (а цяпер няма? Т. Г.) між ёю і пралетарыятам.
>
> У гады грамадзянскае вайны мяшчанства, бязумоўна, выконвала да некаторага стопню контр-рэвалюцыйную ролю...»

Прыведзенага адрыўку зусім даволі для таго, каб паставіць над знак пытаньня ўзровень палітычных ведаў гр. Кундзіша. Бедны «крытык» і ня ведаў нават, што саматужніка-шаўца вельмі і вельмі цяжка прышчапіць да мяшчанства, альбо проста зблытаў сацыяльную групу мяшчанства з мяшчанскім станам у царскі час, да якога належалі тады і рабочыя.

Установіўшы саматужнага крытыка паказае яшчэ, што ён бадай што зусім ня ведае, што такое мяшчанства наогул, і менскае мяшчанства ў прыватнасьці. Трэба добра ведаць Менск, каб рабіць тыя, ці іншыя вывады. А небарака Кундзіш, ня ведаючы ні Менску, ні яго жыхарства трошкі зблытаў і прыняў за мяшчанства тую групу, якая найменей з гэтым мяшчанством зьвязана. Які небудзь пярэшенскі сталяр, ці шавец, які ў большасьці і працуе ў чужой майстэрні, які ў [illegible]сьці выпадкаў ня мае ніякай уласнасьці, апрача якога небудзь ката, і які ў царскі час прымаў самы дзейны ўдзел у забастоўках і дэманстрацыях—ен меней усяго заслугоўвае быць залічаным у катэгорыю мяшчанства. Далей, вымагаць ад 7—10 гадовага хланца, які, натуральна, у сілу эканамічных прычын расьце і выхоўваецца без гувэрнантак, бяз сталага нагляду, стопроцантнай клясавай сьвядомасьці—гэта па меншай меры дзіка і недарочна. І, нарэшце, калі прызнаць нават правату «крытыка» ў яго вызначэньні сацыяльнага эквіваленту, дык і тут уся яго лінія ідзе ў дыякэтральнай процілегласьці з марксыцкімі поглядамі на мастацкую літаратуру. Пляханаў пісаў так:

> „Імкнучыся знайсьці грамадзкі эквівалент данай літаратурнай зьявы, крытыка гэта (матэрыялістычная) здраджвае сваёй уласнай натуры, калі не разумее, што справа ня можа абыйсьціся тым, каб знайсьці гэты эквівалент, і што сацыялёгія павінна не зачыняць дзьверы перад эстэтыкай, а наадварот, адчыняць іх перад ёю. Другім актам вернай сабе матэрыялістычнай крытыкі павінна быць—як гэта было і ў крытыкаў ідэалістаў, ацэнка эстэтычных якасьцяў разглядванага твору. Калі-б крытык матэрыяліст адмовіўся-б ад гэткай ацэнкі па тэй прычыне, што ён ужо знайшоў сацыялёгічны эквівалент дадзена твору, дык гэтым ён толькі выявіў бы сваё неразуменьне таго пункту погляду, на якім яму хочацца замацавацца" („За дваццать лет").

Прачытайце гэты ўрывак, грамадзянін Кундзіш, і, калі можаце яго зразумець, дык павучэцеся!.. Але нам здаецца, што беларускі чытач меў бы права патрабаваць ад «крытыкаў», якіх яму даводзіцца чытаць ва «Узвышшы», прынамсі большай пісьменнасьці, якой заўсёды вымагала сама арганізацыя «Узвышша».

Далей «крытыка» Кундзіша прымае ўжо зусім гумарыстычны характар. То яму не падабаецца, што бацька паэты пачаў бойку з гарадавым, «пяючы марсэльезу». Кундзіш карыстаецца выпадкам, каб адчыніць Амэрыку:

> «Рэвалюцыйнасьць зусім ня ў тым, каб ушчаўшы бойку з гарадавым, сьпяваць марсэльезу, а ў арганізаваным выступленьні мас».

Ды гэта кожны ведае! Але Александровіч ніякай рэвалюцыйнасьці тут і ня зьбіраўся паказываць. Мы дазволім сабе прывесьці гэта месца крыху паўней, чымся наважываецца гр. Кундзіш:

> Пе працуе, працы—нічога,
> дзе мага яго вочы лезуць!
> Раз пьяны страсануў гарадавога,
> трасануў, пяючы марсэльезу.
> Гаварылі яшчэ, што з азартам
> аб калена зламаў „селядзец".
> Прыляцела суседняя варта...
> Так весела страна на бядзе...
> Судзіці... Сядзеў... Вышаў... і г. д.

Прывядзем яшчэ пару радкоў з папярэдняга разьдзелу, якія матывуюць гэткія неэтычныя з пункту погляду гр. Кундзіша паводзіны шаўца:

> Але сьціськала гора вас,—
> тупой сякеры сталь.
> І так жыцьцём зморана
> гібела бедната.
> Але за то? Вось то гэта
> адны ў сухотах мруць,
> другія сытым рогатам
> дукаты ў банк кладуць.

Зразумела вам, гр. Кундзіш, чаму п'яны шавец пяяў марсэльезу? Давядзіся гр. Кундзішу папасьці ў гэткія абставіны—«Інтэрнацыянал» засьпяваў-бы.

А мы ў інтарэсах самай звычайнай аб'ектыўнасьці прымушаны гэткую крытыку*) разглядаць, як злачынную і нясумленную падтасоўку.

Мы ня будзем пакуль што спыняцца на Кундзішавых мудраваньнях пад «румянаю цаглінкай» і «пязнанымі днямі», бо, як відаць, Кундзіш пасьпеў пабываць у сацыялістычнай грамадзе і пазнаць гэтыя дні, ды цаглінны прызвычаіўся бачыць жоўтага колеру. Прапускаем мы і іншыя мясьціны, у якіх гучыць больш іроніі па адрасу нашага будаўніцтва, чымся па адрасу Андрэя Александровіча. Гэта ўсё для нас у значнай ступені зразумела і... ня нова.

Нам толькі здасьціца, што зусім лішнім было бязглудныя разважаньні прыкрываць імём Леніна. Гэта месца мы дазволім сабе працытаваць, каб чытач меў уяўленьне аб «крытыку». Пералічваючы некаторыя эпітэты з вершаў Александровіча, гр. Кундзіш гаворыць:

> «Пямала і „залатых". Да ведама Александровіча і Джугара: ужываць эпітэт «залаты» час ад часу ня шкодзіць, але ня шкодзіць таксама прачытаць у тав. Леніна пра тое, які лёс чакае «золата" ў сацыялістычнай грамадзе".

Чыталі, гр. Кундзіш, але пакуль што ваша «крытыка» застаецца пры вас, а золата яшчэ можа вабіць вока нават сваёю прыгожасьцю. Загляніце ў музэі, дык зраз

СВОДКА № 8

паступленьняў с.-г. падатку кампаніі 1927-28 г. з пачатку кампаніі да 1-га студзеня 1928 году.

АКРУГІ	Налічана падатку.	ПАСТУПІЛА: Акладу	Пяродмы	Пені	УСЯГО	% ВЫПАЎНЕНЬНЯ. Гадавога заданьня	2-га тэрміну	Скідкі дана на:
Віцебская . .	1 232.037	751.621	8.212	5.941	765.774	78,3	97,6	1-XII
Бабруйская .	1.805.127	1.122.310	18.220	8.452	1.148.982	76,8	95,6	„
Полацкая . .	705.945	422.686	4.049	3.496	430.231	73,9	91,9	1-X
Мазырская .	779.589	454.374	3.553	2.167	460.094	73,2	91,3	1-XI
Аршанская .	1.255 827	747.336	12.730	7.304	767.370	73,2	91,1	1-XI
Магілеўская .	1.785.960	1.038.402	16.039	7.059	1.051.500	70,3	87,5	1-XI
Менская . . .	2.084.899	1.154.368	20.173	13.004	1.187.545	68,2	84,3	1-XII
Гомельская .	1.378.536	653.100	13.375	6.368	672.843	61,8	76,7	1-XI
Агулам . .	11.028.919	6.344.197	96.351	53.791	6.494.839	71,6	89,1	

Перавыбары у каапэрацыі.

Падрыхтоўка да перавыбараў праўленьня ЦРК.

Зараз шырока разгорнута праца па перавыбарах праўленьня ЦРК.

Перавыбіраюцца крамныя камісіі, заслухоўваюцца справаздачы старых крамных камісій, упаўнаважаных і праўленьня ЦРК.

Са справаздач крамных камісій і ўпаўнаважаных відаць, што шмат з іх працавалі добра, дзякуючы чаму маюцца відавочныя дасягненьні.

Трэба адзначыць, што крамныя камісіі пры заводзе „Чырвоны Кастрычнік", пры Дзяржаўнай Аршанскай друкарні і на Асінстроі шырока разгарнулі працу на каапэраваньню насельніцтва. У гэтых пунктах крамныя камісіі сумесна з упаўнаважанымі працавалі добра, шмат было зроблена дакладаў, праведзена гутарак і прачытана лекцый на тэмы па каапэраваньню, аб мэтах і задачах каапэрацыі.

З справаздачы праўленьня ЦРК на агульным сходзе пайшчыкаў «Чырвонага Кастрычніка» было відаць, што праца праароблена аграмадная.

Павялічыўся аваротны капітал, павялічыліся ўзносы пайвога капіталу. Адчынена 2 новыя магазыны.

Летась мелася 14 магазынаў, а сёлета маем—16, ларкоў—6, розных складаў—7, сталовых—3, каўбасная майстэрня, хлебапякарня.

Усяго занята на працы ў гэтых прадпрыёмствах: магазынах, ларках, на складах і ў праўленьні—212 чалавек.

Накладныя выдаткі на сабекаштоўнасьць тавараў у параўнаньні з мінулым годам зьнізіліся на 2,5 проц. і зараз складаюць 11,8 проц.

Амаль што ўсе магазыны пераабсталяваны і пашыраны.

У хуткім часе будзе адчынена аграмадны магазын.

Дзякуючы абнаўленьню абслугоўваючага апарату ў хлебапякарні, а таксама праведзенаму пераабсталяваньню, ад хлебапякарні атрымана 4000 р. прыбытку.

Зваротны капітал складае--299,359 р., а ў 25-26 г. ён быў—263,660 руб., павялічэньне на 13,5 проц.

Рынак ахоплівае ЦРК на 75 проц.

Прароблена аграмадная праца па справе зьніжэньня цэн. Зьніжаны цэны па 1,15 проц.

Зараз маецца пайшчыкаў 4339, сяброў саюзаў каапэрыравана—85,92 проц.

Паявы капітал у 1924 г. складаў 2159 р., а зараз—18034 р.

У сярэднім на кожнага перарэгістраванага пайшчыка прыходзіцца па 5 р. 30 к.

Устаноўлена жывая сувязь з пайшчыкамі праз крамныя камісіі і ўпаўнаважаных, якія маюцца па асобных саюзах.

Гэтакіх камісіі маецца зараз—25, у якіх удзельнічае 93 сябры і 34 кандыдаты.

Сувязь з дзяржаўнымі ўстановамі досыць добрая. Праўленьне ЦРК рабіла шмат дакладаў, справаздач на пасяджэньнях прэзыдыуму АВК, пляновай камісіі, гарсавету і каапэрацыйнай сэкцыі гарсавету.

Сувязь з рабочымі і служачымі праводзілася праз эканамічныя і вытворчыя нарады, шырока абгаварвалася праца ў магазынах, аддзяленьнях і прадпрыемствах ЦРК.

З новага 1928 г. ЦРК больш разгорне працу па каапэраваньню і ўдасканаленьню свае працы.

С.

Ворша.

Ці будзе добра?

Праўленьне нашага спажывецкага таварыства абрана з патугай і некаторым націскам з боку кіраўнікоў сходу. Праўда, актыўнымі сябрамі засталіся два партыйцы, але яны нешта ня могуць нагадзіцца ў працы. Так, старшыня Салаўёў два ці тры тыдні здаўляўся ад прыёмкі спраў каапэратыву толькі з тае прычыны, што не хацеў працаваць з другім сябрам праўленьня Логвінавым, цяперашнім рахункаводам, які акрамя рахункаводзтва нічога ня хоча рабіць і дапамагаць Салаўёву. А апошняму шмат працы: ён старшыня, ён закупшчык тавараў, ён і скарбнік.

Ці зможа адзін выконваць усе гэтыя абавязкі?

Партыйная ячэйка сельсавету і райком КПБ усё-ж-такі прымусілі Салаўёва працаваць з Логвінавым. Цяпер Салаўёў і кажа: «Згадзіўся працаваць, але ці на доўга, пабачым!». Каапэратыў у сувязі з правяденьнем другой пуці чыгуначнай дарогі павінен расьці.

А калі ў такіх адносінах будуць працаваць сябры праўленьня ды яшчэ мець вельмі непрактыкаванага прыказчыка ў Паўлючкоўскай краме, дык праца добра ня пойдзе.

— Гора, а ня прыказчык, ён адвучыць ад каапэратыву, а ня прывучыць,—кажуць пайшчыкі.

І запраўды, ня кожны зможа чакаць яго падлічваньня адначасова і на паперы, і на пальцах, і на шчотах.

Пайнік.

Мехаўскі с.-с., Азярышчанскі р., Віцебшчына.

Датаргаваліся...

Нядаўна ў нас адбыліся перавыбары праўленьня Шацкага спажывецкага т-ва. Вынікі працы нашага т-ва за мінулы год, як выявілася са справаздачы, вельмі дрэнныя. Як нядаўна паведамлялася ў друку, растраты лічыліся ў нашым т-ве прыблізна каля 600 руб., па справаздачы-ж праўленьня—растраты лічацца крышку больш: уся растрата складае 2000 рублёў.

Як-жа гэта здарылася?—А вось як: старшыня праўленьня Скорабагаты любіў выпіць, так што к справаздачнаму часу ён не далічыўся 430 рублёў. Ну, а на яго глядзелі і іншыя працаўнікі, нядбайна адносіліся да сваіх абавязкаў, у выніку чаго—агульная растрата ў дзьве тысячы рублёў.

А пайшчык чухай ціпер патыліцу.

Пайшчык.

Шацк, Пухавіцкага р., Меншчына.

Хроніка.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ АКРВЫКАНКОМУ.

Камісія па зьніжэньні цэн ліквідавана.

Прэзыдыум АВК пастанавіў ліквідаваць акруговую камісію на зьніжэньні цэн.

Адміністрацыйныя часткі пры РВК.

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому прызнаў неабходным арганізаваць пры райвыканкомах адміністрацыйныя часткі, якіх да гэтага часу зусім ня было. Па сутнасьці гэтай справы ўзбуджана ходайніцтва перад СНК БССР. Адміністрацыйнаму аддзелу АВК даручана распрацаваць праэкт адпаведнага палажэньня.

Акруговая нарада па дапамозе экспорту.

Пры Менскім АВК утворана нарада па дапамозе экспорту. У склад нарады ўвайшлі: Нахільніцкі (старшыня), Данішэўскі, Эрынгрос, Плоткін і інш.

Крэдыты на разьвіцьцё малочнай справы.

Белсельбанк у другім квартале адпускае каля 150.000 руб. доўгатэрміновага крэдыту на будаўніцтва новых маслабойных і сыраварных заводаў у сельска-гаспадарчых каапэрацыйн. арганізацыях.

Апрача таго, будзе адпушчана на разьвіцьцё малочнай справы да 70000 руб. кароткатэрміновага крэдыту.

Пленум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР.

15-га студзеня адбудзецца пленум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР з удзелам прадстаўнікоў усіх акруговых дзіцячых камісій. Пленум заслухае справаздачы прэзыдыуму Цэнтральн. Дзіцячай Камісіі, Пар. Кам. Асьветы і Пар. Кам. Аховы Здароўя БССР. Апроч гэтага пленум абгаворыць пытаньне барацьбы з дзіцячай бясспрытульнасьцю на транспарце.

Тав. Шукейна — прадстаўнік у 1-м тыражы пазыкі індустрыялізацыі.

У тыражную камісію на розыгрышу пазыкі індустрыялізацыі ў Маскве (1-шы тыраж) выдзелен рабочы-слесар заводу «Энэргія» тав. Шукейка.

Тэрмін карыстаньня ільготнымі студэнцкімі пасьведчаньнямі па чыгунках.

ПК Шляхавых Зносін устанавіў тэрмін, па якім студэнты, якія адъяжджаюць на імовыя вакацыі, могуць карыстацца сваімі ільготнымі студэнцкімі пасьведчаньнямі. Гэты тэрмін устаноўлен з 10-га сьнежня да 15-га лютага.

Навукова-папулярныя лекцыі для рабочай моладзі.

Ячэйка ЛКСМБ і мясцком БДУ сумесна з цэнтральным камсамольскім клюбам „КІМ" наладжваюць цэлы шэраг навукова-папулярных лекцый для рабочай моладзі Менску.

Лекцыі будуць чытаць навуковыя сілы гораду Менску: прафэсары БДУ, інжэнэры, дактары і інш.

Распаўсюджваньне кніг праз спажывецкую каапэрацыю.

За апошнія тры месяцы 1927 году пры нізавую сетку спажывецкай каапэрацыі прадана розных беларускіх кніг на 25.000 руб і расейскіх—на 14.000 руб. Па ўсёй сетцы налічваецца 53 кніжныя полкі і 46 кніжных аддзяленьняў пры каапэрацыйных крамах.

140.000 руб. на пабудоўку сямёхгодкі.

У лютым будзе скончана пабудова будынку для сямёхгодкі на Ляхаўцы. На ўсе будаўнічыя работы было дапушчана 140000 р.

Гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчак.

У сувязі з дырэктывамі ўраду аб гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак Менскі акрвыканком пастанавіў прыступіць сёлета да вывучэньня эканамічнага становішча мястэчак Халопеничы і Сьмілавічы.

У сьнежні завезена ў БССР на 1380 т. р. хлебных прадуктаў.

Па даных Белкаапсаюзу, у сьнежні завезена ў БССР 300 вагонаў жыта і жытняй мукі, 3.95 вагонаў пшанічнай мукі і 92 вагоны круп, аўса і вотрубей. Наогул, хлебных прадуктаў завезена на суму 1.380.000 руб., што складае 73 проц. месячнага пляну.

Рост крэдытаў на жыльлёвае і камунальнае будаўніцтва.

На жыльлёвае і камунальнае будаўніцтва ў гэтым годзе будзе адпушчана 6.511.000 руб. Крэдыту ў мінулым годзе на гэту патрэбу было адпушчана 2.622.100 руб.

Зварот Белпайгандлю.

Гандлёвы пляц Белпайгандлю прадугледжвае звароты па збыту прадукцыі прамысловасьці ВСНГБ на 31.080.000 руб. мясцовай прамысловасьці і працкалектываў—на 1.570.000 руб. Такім чынам, увесь зварот па збыту складае суму ў 32.650.000 руб.

Колькі паступіла страхоўкі да 1-га студзеня.

Водпаг папярэдніх даных, да 1-га студзеня паступіла страхоўкі 1.643.200 руб., што складае 36 проц. гадавога заданьня; у мінулым годзе да гэтага часу страхоўкі паступіла 48 проц.

Вельмі слаба паступае страхоўка ў Менскай, Мазырскай і Віцебскай акругах.

Капітальнае будаўніцтва ў Беларускім папяротрэсьце.

Зацьверджан плян капітальнага будаўніцтва ў Беларускім папяротрэсьце. Згодна гэтага пляну, у бягучым 1927-28 апэрацыйным годзе на капітальнае будаўніцтва ў трэсьце будзе скарыстана—2.800.000 руб.

Барацьба з бяспрытульнасьцю.

У бягучым апэрацыйным годзе, згодна каштарысу Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР, акруговым дзіцячым камісіям на папярэднае працы па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю будзе асигнавана 20.000 руб.

Забесьпячэньне спажывецкай каапэрацыі прамтаварамі.

У студзені Белкаапсаюз вызначыў завезьці для спажывецкай каапэрацыі розных прамысловых тавараў на 2.940.000 руб. Паміж іншым, будзе завезена мануфактуры і галантарэі на 715.000 руб. і бакалейна-гаспадарчых тавараў на 766.000 руб.

400 тысяч рублёў на загатоўку насеньня.

Белсельбанк у першым і другім квартале мае адпусьціць 400000 руб. на загатоўку насеньня да вясеньняй пасяўной кампаніі. Ужо адпушчана 185.000 руб. на гэтую мэту ў першым квартале, а 245.000 руб. будзе адпушчана гэтымі днямі.

ЗДАРЭНЬНІ.

ГВАЛТ НАД 3-ХГАДОВАЙ.

4-га студзеня С. Блювштэйн, праж. па Стараслабодзкай вул. у д. № 11, хацеў зґвалціць 3-хгадовую дзяўчынку, але на крык прыбеглі людзі і перашкодзілі.

Блювштэйн затрыман.

РАСТРАТЧЫК.

Тэхнік Плошчаніцкага райвыканкому Гусеў растраціў 2.000 руб. Растратчык затрыман і прыцягнен да адказнасьці.

ЗАТРЫМАНЬНЕ ЗЛАДЗЕЯЎ.

У Менску Крым. Вышук затрымаў зладзеяў Л. Яроўскага (клічка—«Крывы нос») і Л. Левіна (клічка—„Шэйбэр"), якія прыехалі ў Менск на гастролі з Гомеля.

Крэдыт замацоўвае сялянскую гаспадарку.

Летась на Меншчыне адпушчана было да 2000000 р. сельска-гаспадарчага крэдыту.

У бягучым апэрацыйным годзе будзе выдана на акрузе на ўсе галіны сельскай гаспадаркі 2797000 р. Галоўным чынам крэдыт будзе даваецца на асноўнія затраты сельскай гаспадаркі; на прыкладзе, будзе дадзена крэдыту на земляўпарадкаваньне беднаты і насёлачнікаў—300000 р., на мэліярацыю—216000 руб., на электрыфікацыю—10000 р., на набыцьцё рабочай жывёлы—400000 р., на штучнае ўгнаеньне—116000 р., на трактарызацыю—4000 р. і г. д.

Водпуск на трактарызацыю толькі 4000 р. тлумачыцца тым, што савхозы набыцьцё трактараў вядуць цераз Белсельтрэст. Кароткатэрміновага крэдыту дадзена будзе 40 проц. і рэнта—доўгатэрміновы; прычым 20 проц. усяго крэдыту дасцца на далейшае разьвіцьцё калектыўных гаспадарак і 80 проц.—сялянству.

На мясцох чізавой крэдытнай сеткай крэдыт так будзе разьмяркаваны: беднаце і насёлачнікам адпушчана будзе 48 проц. крэдыту, які адпушчаны сялянству, серадняком—50 проц. і заможнай частцы пападзе ня больш 2 проц. Заможнікам крэдыт адпушчаецца толькі кароткатэрміновы і з высокімі процантамі. Такім чынам с-г. крэдыт у вёсках Меншчыны зьлялецца магутным фактарам, які дапамагае ўсходу руні сацыялістычных пачаткаў у сялянскай гаспадарцы.

М.

Апавяшчэньні.

Даклад т. Раппо.

Намесьнік Наркамасьветы Украіны тав. Раппо Я. П., які прыехаў на Сэйю ЦВК БССР, у пакадзелак, 12-га студзеня, а 9-й гадзіне ўвечары ў Доме Асьветы зробіць даклад на тэму: „Будаўніцтва асьветы на Украіне".

На сход запрашаюцца ўсе культ-працаўнікі і настаўніцкія колы г. Менску.

ДОМ АСЬВЕТЫ:

8-га студзеня—практычныя заняткі ваенгуртка Дому Асьветы па стральбе ў клюбным піры з 11-12 г. дня, пасьля—экскурсія ў Дом Чырвонай арміі.

На 9-га студзеня а 7 г. увеч. Праўленьне НД Асьветы запрашае усіх б. сяброў драмгуртка і „Сіняй блузы", а таксама ўсіх сяброў Дому і саюзу, жадаючых прыняць удзел у драматычнай пастаноўцы «Ночь перед Рождеством» у сучаснай апрацоўцы.

— У аўторак, 10-га студзеня, адбудзецца адчынены сход ячэйкі КП(б)Б Працасьветы. Абвестка дня: Даклад тав. Брыгневіча аб рабоце подгабінэту. Пачатак роўна а 7 гадзіне ўвеч.

Размах савецкай навукі.

КОЛЬКІ ВУЧОНЫХ У СССР.

За дзесяць гадоў існаваньня савецкай улады колькасьць вучоных у СССР дасягнула 15-20 тысяч. Усе гэтыя навуковыя працаўнікі разьмяркованы паміж 2.500 навуковымі ўстановамі Саюзу, раскінутымі на ўсёй яго тэрыторыі, пачынаючы ад дробных краязнаўчых установ у далёкіх правінцыях і канчаючы буйнейшымі сусьветнымі ўстановамі з многімі сотнямі вучоных спэцыялістаў і цэлымі гарадкамі лябараторый, інстытутаў, музэяў і г. д.

УСЕСАЮЗНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК.

Усесаюзная Акадэмія Навук у Ленінградзе складаецца з 40 устаноў рознага тыпу, пачынаючы з агрмадных музэяў сусьветнай значнасьці, як Зоолёгічны музэй, і канчаючы спэцыяльнымі камісіямі і низьлічонымі інстытутамі і лябаратарыямі; у іх працуе звыш тысячы чалавек навукоўцаў і навукова-тэхнічнага персаналу. Акадэмія Навук раскінута ў 20 будынках, з агульнай плошчай падлогі звыш 100 тысяч квадратных мэтраў, гэта значыць, крыху менш 10 дзесяцін.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЭРМІТАЖ.

Дзяржаўны Эрмітаж у Ленінградзе, як і Ўсесаюзная Акадэмія Навук, толькі за апошнія гады савецкага будаўніцтва набыў і сучасныя формы і сучасную арганізацыю. Каб абыйсьці ўсе выставачныя памяшканьні Эрмітажу і агледзіць усе яго калекцыі, трэба прайсьці каля 60 кілёмэтраў. Чалавек, які жадае больш-менш стала вывучаць мастацтва і яго гісторыю, можа азнаёміцца са зборамі Эрмітажу ня менш, чымся ў працягу аднаго месяца. Колькасьць асобных памяшканьняў і накоўў гэтага музэю дасягае пасьля далучэньня да яго памяшканьня б. Зімняга дварца да адной тысячы.

ІНШЫЯ БУЙНЫЯ МУЗЭІ.

Ня меншыя маштабы і іншых музэяў, як Зоолёгічны, Геолёгічны і Этнаграфічны, музэі Акадэміі Навук. Кожны год у іх паступае некалькі сот пудоў новых рэчаў, а агульная колькасьць экзэмпляраў вылічаецца ў сотнях тысяч. За гады рэвалюцыі нацыянальны Геолёгічны музэй узрос у 12 разоў, а зборы нацыянальнага мінэралёгічнага музэю павялічыліся ў чатыры разы.

БІБЛІЯТЭКІ І НАВУКОВАЕ ВЫДАВЕЦТВА.

Найвялікшыя ў СССР бібліятэкі—Публічная бібліятэка ў Ленінградзе, Ленінская ў Маскве і бібліятэка Акадэміі Навук. Акадэмічная бібліятэка зьяўляецца адной з пяці самых буйных у сьвеце. Яна налічвае ў сваіх васьмі паверхах каля 4-х мілёнаў тамоў. Гэтыя выданьні пакладзены на паліцах, якія разам складаюць 54 кілёмэтры.

Кожны год у СССР выдаецца да 6 тысяч аркушаў навуковай літаратуры.

НАВУКОВЫЯ ЭКСПЭДЫЦЫІ.

Экспэдыцыі савецкіх вучоных шырока разьвіліся па ўсёй тэрыторыі СССР, і каля 5.000 навуковых камандыровак і экспэдыцый, дасьледчых атрадаў перасеклі за апошні час розныя райёны Саюзу. Асабліва шырока разьвілася экспэдыцыйная чынасьць геолёгічнага камітэту і Ўсесаюзнай Акадэміі Навук.

Замест выпадковых навуковых работ, зараз пакладзен пачатак усебаковаму вывучэньню вытворчых сіл паасобных рэспублік. Такую працу Акадэмія Навук распачала ў Якуцкай рэспубліцы і ў Казакстане, тэрыторыя якога ў пяць разоў большая за тэрыторыю Нямеччыны.

Такім чынам, мінулыя 10 гадоў паклалі грунт арганізацыі савецкай навукі, паставілі перад ёй складаныя задачы і вызначылі формы і мэтады іх вырашэньня.

ЗАКОНЫ і ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб зьмене п. п. „а" і „в" арт. 2 і ўвагі да яго і арт. арт. 3, 4, 5, 7, 9 і 12 «Палажэньня аб Бюджэтнай Камісіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР".

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Зьмяніць п. п. „а" і „в" арт. 2 і ўвагу да яго і арт. арт. 3, 4, 5, 7, 9 і 12 „Палажэньня аб Бюджэтнай Камісіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР" (Збор. Зак. і Заг. БССР за 1925 г. № 32, арт. 294), запісаўшы іх у наступнай рэдакцыі:

1. п. „а" арт. 2 „разгляд алобраных Саветам Народных Камісараў БССР дзяржаўнага бюджэту і своду мясцовых бюджэтаў БССР ва ўсіх іх частках";

2. п. „в" арт. 2 „разгляд справаздач аб выдаткаваньні дзяржаўнага бюджэту і своду мясцовых бюджэтаў БССР, пасьля разгляду іх Саветам Народных Камісараў";

3. увага да арт. 2: „Бюджэтная Камісія мае права запатрабаваць ад адпаведных органаў прадстаўленьня ўсякага роду матар'ялаў, якія датычацца дзяржаўнага бюджэту і своду мясцовых бюджэтаў БССР.

Члены Бюджэтнай Камісіі, якім Камісіяй даручана папярэдняя апрацоўка паасобных бюджэтаў ведамстваў, акруг і г. д. таксама маюць права запатрабаваць ад адпаведных органаў неабходныя матар'ялы і ўдзельнічаць у разглядзе даручаных ім кампетарысаў і бюджэтаў на ўсіх інстанцыях".

4. Арт. 3: „Паказаньні ў п. „а" арт. 2 гэтага Палажэньня дзяржаўны бюджэт і свод мясцовых бюджэтаў БССР падаюцца ў Бюджэтную Камісію, якая разглядае ўсе пытаньні для дакладу аб гэтым Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту".

5. Арт. 4: „Бюджэтная Камісія складае даклад па разглядзенным Саветам Народных Камісараў праекце дзяржаўнага бюджэту і своду мясцовых бюджэтаў і падае яго са сваім заключэньнем у Цэнтральны Выканаўчы Камітэт у відзе праекту пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту".

6. Арт. 5: „Пры разглядзе і зацьвярджаньні дзяржаўнага бюджэту і своду мясцовых бюджэтаў Сесіяй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту прадстаўнік Савету Народных Камісараў выступае ў якасьці дакладчыка, а прадстаўнік Бюджэтнае Камісіі—у якасьці садакладчыка".

7. Арт. 7: „Бюджэтная Камісія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту выдзяляе са свайго складу Прэзыдыум у 7 асоб, у гэтым ліку Старшыню і яго намесьніка. Сэкратар Бюджэтнай Камісіі назначаецца Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту".

8. Арт. 9: „Пры абгаварэньні ў Бюджэтнай Камісіі дзяржаўнага бюджэту і своду мясцовых бюджэтаў дакладчыкам ад Савету Народных Камісараў зьяўляецца асоба спэцыяльна на гэта ўпаўнаважаная Саветам Народных Камісараў.

Увага: Для ўдзелу ў абгаварэньні своду мясцовых бюджэтаў, Бюджэтная Камісія абавязана выклікаць прадстаўнікоў зацікаўленых акруговых выканаўчых камітэтаў".

9. Арт. 12: «Пасяджэньні Прэзыдыуму Бюджэтнай Камісіі лічацца сапраўднымі, калі на іх прысутнічае ня менш чатырох членаў Прэзыдыуму, у тым ліку Старшыня Камісіі, або яго намесьнік».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

22 сьнежня 1927 году.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской Социалистической Советской Республики

об изменении п. п. «а» и «в» статьи 2 и примечания к ней и ст. ст. 3, 4, 5, 7, 9 и 12 „Положения о Бюджетной Комиссии Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР".

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

Изменить п. п. «а» и „в" статьи 2 и примечание к ней и ст. ст. 3, 4, 5, 7, 9 и 12 „Положения о Бюджетной Комиссии Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР" (Собр. З. и Р. БССР а 1925 г. № 32, ст. 294), изложив их в следующей редакции:

1. п. «а» ст. 2 „рассмотрение одобренных Советом Народных Комиссаров БССР государственного бюджета и свода местных бюджетов БССР во всех их частях".

2. п. «в» ст. 2 „рассмотрение отчетов об исполнении государственного бюджета и свода местных бюджетов БССР после рассмотрения их Советом Народных Комиссаров".

3. Примечание к ст. 2: „Бюджетная Комиссия имеет право затребовать от соответствующих органов представления всякого рода материалов, касающихся государственного бюджета и свода местных бюджетов БССР.

Члены Бюджетной Комиссии, которым поручена предварительная обработка отдельных бюджетов ведомств, округов и т. д., также имеют право затребовать от соответствующих органов необходимые материалы и участвовать в рассмотрении порученных им смет и бюджетов во всех инстанциях".

4. Ст. 3: „Указанные в п. «а» ст. 2 настоящего Положения государственный бюджет и свод местных бюджетов БССР представляются в Бюджетную Комиссию, которая рассматривает все вопросы для доклада об этом Центральному Исполнительному Комитету".

5. Ст. 4: „Бюджетная Комиссия составляет доклад по рассмотренным Советом Народных Комиссаров проектам государственного бюджета и свода местных бюджетов и представляет его со своим заключением в Центральный Исполнительный Комитет в виде проекта постановления Центрального Исполнительного Комитета".

6. Ст. 5: „При рассмотрении и утверждении государственного бюджета и свода местных бюджетов Сессией Центрального Исполнительного Комитета представитель Совета Народных Комиссаров выступает в качестве докладчика, а представитель Бюджетной Комиссии—в качестве содокладчика".

7. Ст. 7: „Бюджетная Комиссия Центрального Исполнительного Комитета выделяет из своей среды президиум из 7 человек, в том числе председателя и его заместителя. Секретарь Бюджетной Комиссии назначается Президиумом Центрального Исполнительного Комитета".

8. Ст. 9: „При обсуждении в Бюджетной Комиссии государственного бюджета и свода местных бюджетов, докладчиком от Совета Народных Комиссаров выступает в качестве докладчика, а представитель Бюджетной Комиссии—в качестве содокладчика".

9. Ст. 12: «Заседания Президиума Бюджетной Комиссии считаются действительными, если в них присутствуют не менее четырех членов Президиума, в том числе Председатель Комиссии или его Заместитель".

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

22 декабря 1927 г,
г. Минск.

Паштовая скрынка.

СКРЫПКУ ЯНКУ МІХАСЁВУ.

(5 рота, 22 страл. полк.)

Па вашаму лісту высьвятлена, што Бабруйская акр. камісія па вызначэньню пэнсій на сваім апошнім пасяджэньні (ад 9-12 1927 г.) згадзілася з пастановай Клічаўскай райкамісіі і адмовіла ў выдачы пэнсіі вашай матцы, як матар'яльна забясьпечанай: мае зямлі ворнай 3,75 да., сенажаці 1 дзес., 1 карову і хату. Палову зямлі ваша матка аддае ў арэнду свайму зяцю, пры якім і жыве Ліхтар.

Па вашаму допісу „Шунае выхаду" праведзена дазнаньне. Сяляне вёсак. Завішына, Любоча і засьц. Гута на агульных сходах прызналі працу лістаносца Ганаровіча здавальняючай.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

Мазырскі гарсавет выклікае на 15 студзеня г. г. на 12-ю гадз. дня на справе скасаваньня шлюбу гр-на ТРЭССА Міхася Рыгоравіча з гр-кай ГЛУСКІНАЙ-ТРЭСС Раісай Якубавай.

КІНО-ТЭАТР.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Нядзеля, 8-1, „Цар Максімільян", драма ў трох дзеях з інтэрмэдыяй. Пачатак а 8 з палов. гадз.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА»	Сучасная драма „ЖЕНА" у 6 частках. Звыш праграмы—Рычард Талмэдж у камэдыі «Ловкие дельцы» у 6 частк.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	З аўторка, 3-а студзеня, новая заграніччная пастаноўка „ГОЛУБАЯ КРОВЬ" Маст. драма ў 6 частках. АНОНС! Наступная пастаноўка—амэрыканскі баявік «ВЕЧНАЯ БОРЬБА»
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	З аўторка, 3 студзеня, „ВАША ЗНАКОМАЯ" Суч. бытавая драма ў 6 частк.
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".	З аўторка, 3 студзеня, 3-я апошняя серыя „КЛЕЙМО ПРЕСТУПЛЕНИЯ".)—(Кіно-раман у 8 частках.)—(

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

НАВІНКА

БЕЛАРУСКАЕ ЛІТАРАТУРЫ

ТАРАС ГУШЧА (Якуб Колас).

У ГЛЫБІ ПАЛЕСЬСЯ.

Стар. 201. Цана 1 р. 60 к.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ!

Кантора газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

просіць менскіх падпісчыкаў, якім належыць атрымаць

ПРЭМІЮ,

кніжкі касы ашчадасьці,

зьявіцца для атрыманьня іх у кантору газэты.

БАЛЯНС

ЦЭНТРАЛЬНАЙ ДЗІЦЯЧАЙ КАМІСІІ ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ВЫКАНАЎЧЫМ КАМІТЭЦЕ БССР

НА 1 КАСТРЫЧНІКА 1927 ГОДУ.

№№ чарг.	НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА Прыватная	Агульная
1	Каса		490—68
2	Бягучы рахунак у Дзяржбанку № 14	145150—18	
3	Бягучы рахунак у Дзяржбанку № 245	10 —	
4	Бягучы рахунак у Дзяржбанку № 570	3170—62	
5	Бягучы рахунак у Прамбанку № 323	4809—28	
6	Бягучы рахунак у Касе ашчад. № 10072	— —86	153140—94
7	Каштоўныя паперы . . .		2165 —
8	Вэксалі атрыманыя . . .		350 —
9	Тары		290 —
10	Дэбіторы: . . .		
	а) Розныя асобы і ўстановы .	20639—41	
	б) Акруговыя . .	72698—06	93337—47
11	Выдаткі бягучага году: . .		
	а) Школьны значок . .	533—35	
	б) Плякат . . .	2003—45	
	в) Дзяржаўны гэрб . .	500	3036—80
	БАЛЯНС . .	—	252810—89

№№ чарг.	НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА Прыватная	Агульная
1	Крэдыторы:		
	Розныя асобы і ўстановы .	—	369—88
2	Капітал	—	252441—01
	БАЛЯНС . .	—	252810—89

Нам. старшыні ЦК дапамогі дзецям БУДЗІН.

Рахункавод НЕПРАЎСКІ.

НОВЫЯ КНІГІ.

№№ п. п.	АЎТАР І НАЗВА КНІГІ	Лік старонак	ЦАНА Р.	К.
	ПАДРУЧНІКІ.			
1	А. В. Багдановіч—Беларуская мова . .	206	1	25
2	М. Тайшын.—Палітграмата	414	1	50
	МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА.			
1	А. Александровіч—Угрунь. Вершы . . .	128	—	80
2	М. Грамыка—Дзьве паэмы	136	—	65
3	» —Плынь. Вершы	138	—	80
4	З. Бядуля.—Паэмы	114	1	—
	ПАЛІТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА.			
1	Рэзалюцыі і пастановы XI зьезду камуністычнай партыі(б)Б	60	—	
2	XV зьезд УсеКП(б), справаздача ЦК . . .	111	—	65
	ЛЕНІНСКАЯ ЛІТАРАТУРА.			
1	Н. Ленін. Тактыка Р. К. П.	42	—	10
2	У. І Ленін аб прафсаюзах	98	—	20
3	» » аб сусьветнай вайне . . .	61	—	15
	ПОПУЛЯРНА-НАВУКОВАЯ ЛІТАРАТУРА.			
1	Н. Рубакін. На плывучых крыгах . . .	109	—	80
2	Праф. Анучын.—Вынаходка агню . . .	33	—	20
	НА ЯЎРЭЙСКАЙ МОВЕ.			
1	Ліліна.—Дзеці рэвалюцыі	41	—	45
	НА ПОЛЬСКАЙ МОВЕ.			
1	Рольнік взоровы. Вясна	72	—	45
2	Рольнік взоровы. Лета	64	—	45

1—2